„Разьвіць узмоцненую работу па арганізацыйна-гаспадарчым умацаваньні калгасаў“. (ЦК УсеКП(б)

# Праверкай разьмеркаваньня даходаў у калгасах

Пралетары ўсіх краёў, злучайцеся!

# ЗЬВЯЗДА

Орган ЦК і Мен. Гаркому Камуністычнай партыі (б) Беларусі.

Год выданьня—XV
№ 286 (4192)
Аўторак 20 кастрычніка 1931 г.
Выходзіць БЕСЬПЕРАПЫННА.

## У бліжэйшыя дні завяршыць уборку бульбы

Плошча, засеяная пад гародніну ў гэтым годзе, значна павялічана, у прыватнасьці павялічылася плошча пасеву БУЛЬБЫ. У сёлетнюю пасеўкампанію па БССР было засеяна 554.663 гэктары бульбы супроць 515.965 гэкт. у мінулым годзе. Гэта дае магчымасьць ня толькі поўнасьцю забясьпечыць бульбай гарады БССР, але і своячасова выканаць планы вывазкі бульбы ў прамысловыя цэнтры Саюзу.

Аднак, мала засеяць бульбу; яе трэба своячасова УБРАЦЬ І РЭАЛІЗАВАЦЬ УРАДЖАЙ. Уборка бульбы — важнейшая гаспадарча-папітычная кампанія, ад посьпеху якой залежыць посьпех снабжэньня пралетарскіх цэнтраў нашай краіны.

З кожным днём растуць рады пераможцаў на фронце бульбаўборкі. Перадавыя калгасы, саўгасы, сельсаветы і раёны, якія па-баявому ўключыліся ва ўборачную кампанію, разгарнулі сапраўды бальшавіцкія тэмпы работы, пасьпахова скончылі і канчаюць уборку.

Аднак, тэмпы выбаркі бульбы ў большасьці раёнаў БССР усё яшчэ нездавальняючыя. 15 кастрычніка быў апошні тэрмін скончэньня ўборкі. Між тым, да гэтага тэрміну поўнасьцю скончылі ўборку толькі тры раёны — ЛЁЗЬНЯНСКІ, АСЬВЕЙСКІ І РАСОНСКІ.

Блізкі да скончэньня ўборкі: ПОЛАЦКІ, ВУЗЬДЗЕНСКІ, МАГІЛЕЎСКІ, БЯГОМЛЬСКІ, ЧЫРВОНАПОЛЬСКІ, СІРОЦІНСКІ, ЛЕЛЬЧЫЦКІ І ПУХАВІЦКІ РАЁНЫ.

Астатнія раёны адсталі, прычым, частка раёнаў (ЧАВУСКІ, РЭЧЫЦКІ, КАПЫЛЬСКІ, СТАРА-ДАРОСКІ) ганебна цягнуцца ў глыбокім тыле, у выніку на 15 кастрычніка плян уборкі ў среднім па рэспубліцы выканан толькі на 63,2 проц.

У чым-жа корань зла?

Партыя з самага пачатку кампаніі завастрыла ўвагу ўсіх арганізацый, што посьпех уборкі бульбы знаходзіцца ў непасрэднай залежнасьці ад правільнай АРГАНІЗАЦЫІ ПРАЦЫ на падставе сапраўднай ЗЬДЗЕЛЬШЧЫНЫ і своячасовага ЎЛІКУ ПРАЦЫ, правільнай, глыбока прадуманай РАССТАНОЎКІ СІЛ, шырокага разгортваньня на ўборцы САЦЫЯЛІСТЫЧНЫХ МЭТАДАЎ ПРАЦЫ — сацспаборніцтва і ўдарніцтва.

Іменна гэтага ня ўлічылі многія раённыя арганізацыі. Матар'ялы з месц паказваюць, што далёка ня ўсюды забясьпечана выразнае ПЛЯНАВА-АПЭРАЦЫЙНАЕ КІРАЎНІЦТВА ўборкай бульбы. У радзе калгасаў і саўгасаў існуе поўная блытаніна, безадказнасьць, нядбайнасьць, адсутнічае працдысцыпліна на ўборцы бульбы. Нярэдкі выпадкі, калі ў тым ці іншым калгасе з сотан працаздольных калгаснікаў і калгасніц на ўборцы бульбы працуе 10-15 чалавек (калгас «Рэвалюцыя»—Быхаўшчына і інш.).

На ўсе калгасы і саўгасы пераявлі ўборку бульбы на зьдзельшчыну. У паасобных калгасах Клімаўшчыны, Вушаччыны, Брагіншчыны зьдзельшчына была праведзена толькі фармальна, на справе-ж калгаснікі працуюць старымі, зжытымі мэтадамі.

ЖАНОЧАЯ РАБОЧАЯ СІЛА ня была поўнасьцю прыцягнута да ўборачнай кампаніі. Многія праўленьні калгасаў і саўгасаў нічога не зрабілі для арганізацыі ясляй, пляцовак і іншых культурна-бытавых устаноў.

Адсутнасьць масава-палітычнай работы закон уборачнай кампаніі, адсутнасьць зьдзельшчыны ва многіх калгасах — прыводзіць да ўзьнікненьня спажывецкіх настрояў сярод паасобных адсталых груп калгаснікаў.

Яркім прыкладам гэтага можа служыць КАЛГАС ІМЯ ВАРАШЫЛАВА ВЭНДАРСКАГА СЕЛЬСАВЕТУ (Магілеўшчына), аб якім сёньня намі друкуецца матар'ял.

Усякія тэндэнцыі сыграць на ня зьнішчаных яшчэ сярод адсталых груп калгаснікаў дробнаўласьніцкіх спажывецкіх пачуцьцях павінны сустракаць руйнуючы адпор з боку ўсіх партыйных і савецкіх арганізацый.

Недапушчальна зацягваюць уборку бульбы САЎГАСЫ. На 15 кастрычніка яны ўбралі толькі 39,1 проц. засеянай плошчы, прычым асабліва дрэнна стаіць зьдзельшчына ў ПРЫГАРАДНЫХ савецкіх гаспадарках. Апошнія выканалі плян уборкі толькі на 33 проц. Тут мы маем яўную пагрозу масавай пагібелі бульбы. Сыстэма спажывецкай кааперацыі ня здолела стаць на чале гэтай важнейшай кампаніі, нападзіць жывое кіраўніцтва ўборкай у сваіх саўгасах.

Многія фабзаўкомы ня ўключыліся яшчэ ў арганізацыю рэгулярнай дапамогі прыгарадным гаспадаркам у правядзеньні ўборкі, не мабілізавалі вакол гэтай справы шырокія масы рабочых і служачых.

З другога боку ёсьць і такія выпадкі, калі рабочыя брыгады, якія прыходзяць на дапамогу саўгасам і калгасам, скарыстоўваюцца нерацыянальна, або даюць зусім не скарыстоўваюцца.

Патрэбен карэнны перапом. На аснове сапраўднай зьдзельшчыны, правільнай расстаноўкі сіл, узаемадапамогі калгасаў, саўгасаў і аднаасобнікаў, трэба забясьпечыць максымальнае фарсаваньне ўборкі бульбы і скончэньне яе ў бліжэйшыя-ж дні. Вакол гэтага павінна быць мабілізавана ўвага ўсіх партыйных арганізацый.

Адначасова трэба «ЗЬВЯРНУЦЬ УВАГУ НА ЯКАСЬЦЬ КАПАНЬНЯ БУЛЬБЫ З ТЫМ, КАБ ПРАВЕСЬЦІ ПЕРАБОРВАНЬНЕ ПЛОШЧЫ ПАД БУЛЬБАЙ» (з пастановы ЦК КП(б)Б).

ЯКАСЬЦЬ КОПКІ — важнейшы момант уборачнай кампаніі. Справа ня толькі ў разьмеры ўбранай плошчы, а і ў тым, ЯК гэта плошча ўбрана. Паведамленьні з месц сьведчаць, што некаторыя калгасы і саўгасы ў пагоні за плошчай не зварачаюць ніякай увагі на якасьць, пакідаюць у зямлі шмат бульбы, не перавораваюць плошчу пасьля копкі.

Вышэй сьцяг сацспаборніцтва на полі! Перадавыя калгасы, саўгасы і сельсаветы павінны арганізаваць грамадзкі буксір адстаючых, дапамагчы ім у скончэньні ўборкі. Ні аднэй бульбіны не пакінуць у полі, — такая баявая задача бліжэйшых дзён.

Другая ня менш адказная задача — СВАЯЧАСОВА І ПОЎНАСЬЦЮ ВЫКАНАЦЬ ПЛЯН АДГРУЗКІ БУЛЬБЫ ЛЕНІНГРАДУ. Паводле дырэктывы ЦК КП(б)Б адгрузка бульбы Ленінграду павінна быць скончана не пазьней 1 пістапада. Між тым, сёньнішні тэмп адгрузкі ні ў якім разе не забясьпечвае своячасовага выкананьня пляну. Замест 500 вагонаў у дзень адгружаецца толькі 200-300 вагонаў. Прычына — апартуністычная бязьдзейнасьць многіх загатоўчых арганізацый, яўная недаацэнка важнасьці своячасовага забясьпячэньня асноўных прамысловых цэнтраў бульбай.

Месьніцкія, спажывецкія тэндэнцыі даюць сябе адчуваць і на гэтым вучастку. У паасобных мясцох, пад уплывам кулацкай агітацыі, праводзіцца практыка ўтойваньня бульбы, нежаданьне здаць яе для адгрузкі пралетарскім цэнтрам. Зусім зразумела, што абавязак усіх партарганізацый — бязьлітасна змагацца з такімі настроямі, даць ім руйнуючы адпор.

Нарэшце, марудныя тэмпы адгрузкі бульбы зьяўляюцца вынікам няўменьня бульбазагатоўшчыкаў арганізаваць работу, нападзіць бесьперабойны бульбяны канвэер: з поля накіроўваць бульбу непасрэдна на чыгуначную станцыю.

Кожны дзень на многіх станцыях чыгункі ЗАСТАЮЦЦА НЕСКАРЫСТАНЫМІ ДЗЕСЯТКІ ВАГОНАЎ, на якія загатоўцы даюць заяўкі, але не забясьпечваюць своячасовага падвозу бульбы. 14 кастрычніка застаўся непагружаным 21 вагон, 15-га — 28 вагонаў, 16-га — 41 вагон, 17-га — 54 вагоны. У той-жа час на радзе іншых станцый не хапае вагонаў і бульба застаецца непагружанай. Так, 14-га—ня былі задаволены заяўкі загатоўцаў на 44 вагоны, 15-га—на 53, 16-га—на 82 і г. д.

Гэты разнабой у работе загатоўшчыкаў трэба канчаткова піківаваць. Вінаватых у зрыве адгрузкі і ў простоі вагонаў трэба прыцягваць да суровай адказнасьці.

Уборка і адгрузка бульбы павінны быць пераведзены на сапраўды баявыя рэйкі. Бальшавіцкімі мэтадамі працы, рашучым націскам на кулацка-заможныя элемэнты, бязьлітасным адпорам правым і «левым» апартуністам,—забясьпечым пасьпяховае завяршэньне ўборкі бульбы, поўнасьцю і своячасова выканаем свае абавязкі перад пралетарскімі цэнтрамі.

## ДАБІЦЦА ВЫПРАЎЛЕНЬНЯ СКАЖЭНЬНЯЎ ДЫРЭКТЫЎ ПАРТЫІ ДАПУШЧАНЫХ ПРЫ СКЛАДАНЬНІ ПРАЕКТАЎ

Разьмеркаваньнем ураджаю толькі па працаднёх яшчэ больш узьнімем энтузіязм кальгасьнікаў, накіруем іх вытворчую актыўнасьць на арганізацыйна-гаспадарчае ўмацаваньне калгасаў, нанясем руйнуючы ўдар дробна-буржуазнай ураўнілаўцы

## АБ ХОДЗЕ РАЗЬМЕРКАВАНЬНЯ ДАХОДАЎ У КАЛГАСАХ

*Пастанова прэзыдыуму ЦККК УсеКП(б) і калегіі НК РСІ СССР*

Зробленая праверка ходу разьмеркаваньня даходаў у калгасах паказвае, што растлумачальная кампанія вакол пастаноў чэрвеньскага пленуму ЦК УсеКП(б) і пастановы Наркамзему СССР і Калгасцэнтру аб разьмеркаваньні даходаў у радзе калгасаў праведзена нездавальняюча, у выніку чаго значная частка калгаснікаў не азнаёмлена з парадкам разьмеркаваньня даходаў. Побач з гэтым прэзыдыум ЦККК і Калегія НК РСІ СССР адзначаюць, што ў радзе раёнаў кіраўніцтва райкалгасасобаў кампаніяй па разьмеркаваньні даходаў пастаўлена надзвычай нездавальняюча.

У мэтах правільнага разьмеркаваньня даходаў у калгасах ва ўстаноўлены тэрмін да 15 студзеня, прэзыдыум ЦККК і калегія НК РСІ СССР, улічваючы ўжо даныя па гэтым пытаньні дырэктывы, у прыватнасьці пастанову Калгасцэнтру СССР і РСФСР ад 20-га верасьня гэтага году прапануе Калгасцэнтру СССР У ДЗЕСЯЦІДЗЕННЫ ТЭРМІН правесьці рад мерапрыемстваў у тым ліку: АРГАНІЗАВАЦЬ у апараце райкалгасасобаў ДАКЛАДНУЮ ПРАВЕРКУ ПРАЕКТАЎ РАЗЬМЕРКАВАНЬНЯ ДАХОДАЎ, якія прадстаўляюцца праўленьнямі калгасаў, строгае захаваньне прынцыпаў разьмеркаваньня даходаў толькі па працаднёх і інш.

Прыняць рашучыя меры да прывядзеньня ў парадак у адстаючых калгасах уліку працы, а таксама і агульнага ўліку даходаў і расходаў. Прапанаваць райкалгасасобаям у дзесяцідзённы тэрмін шляхам праверкі кожнага калгасу ў паасобку, дабіцца таго, каб:

а) працоўныя кніжкі абавязкова знаходзіліся ў саміх калгаснікаў, ні ў якім разе не згрупоўваліся і хаваліся ў канторы калгасу;

б) запісы ў іх рабіліся акуратна штодзённа і ва ўсякім выпадку не радзей аднаго разу ў пяцідзённую прычым павінна запісвацца ня толькі колькасьць непічаных калгаснікаў працадзён, але і колькасьць выкананай работы паводле ўстаноўленых норм.

Улічваючы ,што ў радзе выпадкаў праўленьні калгасаў пры правядзеньні авансаваньня стапі на шлях кулацкай ураўнілаўкі, даць дырэктыву калгаснай сыстэме аб тым, каб пры разьмеркаваньні наступнай долі даходаў, якія прылічваюцца калгаснікам, БЫЛІ ВЫПРАЎЛЕНЫ ЎСЕ ДАПУШЧАНЫЯ пры першым авансаваньні памылкі і скажэньні з тым, КАБ АГУЛЬНАЯ СУМА ДАХОДУ КАЛГАСЬНІКА ЯК НАТУРАЙ, ТАК І ГРАШЫМА, ДАКЛАДНА АДПАВЯДАЛА ЎСЁЙ КОЛЬКАСЬЦІ ВЫПРАЦАВАНЫХ КАЛГАСЬНІКАМІ ПРАЦАДЗЕН З 1 СТУДЗЕНЯ 1931 г.

Зьвярнуць асаблівую ўвагу НА НЕДАПУШЧАЛЬНАСЬЦЬ стварэньня яўна ПЕРАПАВЯЛІЧАНЫХ СПЭЦЫЯЛЬНЫХ ХАРЧОВЫХ ФОНДАЎ (у паасобных калгасах 30-40 проц. да фондаў разьмеркаваньня харчовага хлеба па працаднёх), якія штучна зьнімаюць таварнасьць калгасаў, зрываюць асноўны прынцып разьмеркаваньня харчовага збожжа па працаднёх. Устанавіць дакладную праверку выдачы харчовага збожжа са спэцыяльных фондаў толькі тым калгаснікам, хто сапраўды добрасумленна працуе, але не выпрацаваў неабходнай колькасьці працадзён для забясьпячэньня сваёй сям'і харчамі, адыходнікаў і інш. катэгорыі калгаснікаў, устаноўленыя згодна пастановы Наркамзему і Калгасцэнтру ад 12 ліпеня 1931 году. Тыя калгаснікі, якія нядобрасумленна працуюць, павінны пазбаўляцца права атрыманьня з гэтых фондаў.

ГРАМАДЗКАЕ ХАРЧАВАНЬНЕ ў полі, якое арганізуецца па жаданьні калгаснікаў, павінна ісьці ЗА ЛІК САМІХ КАЛГАСЬНІКАЎ з прадукцыі, што яны атрымліваюць. Парадак прамадзкага харчаваньня ў полі ўстанаўляе кожны калгас.

АБАВЯЗАЦЬ РЭСПУБЛІКАНСКІЯ, КРАЁВЫЯ (АБЛАСНЫЯ) І РАЁННЫЯ КК-РСІ ЎСТАНАВІЦЬ СЫСТЭМАТЫЧНЫ НАГЛЯД ЗА ХОДАМ РАЗЬМЕРКАВАНЬНЯ ДАХОДАЎ, РАШУЧА ЗМАГАЮЧЫСЯ З УСІМІ СКАЖЭНЬНЯМІ ЛІНІІ ПАРТЫІ Ў ГЭТЫМ ПЫТАНЬНІ.

## Пераканаліся на справе ў карысьці спэцыялізацыі калгасу

МАГІЛЁЎ. Вясной паасобныя калгаснікі арцелі «Прамень абуджэньня» пайшлі на павадку ў кулака, выступалі супроць спэцыялізацыі гаспадаркі, супроць разьвіцьця гародніцтва і жывёлагадоўлі. Дзякуючы масавай рабоце, і шырокаму растлумачэньню значэньня спэцыялізацыі кулацкая агітацыя была разсеяна. Калгаснікі актыўна ўзяліся за сяўбу гародніны, будаўніцтва свінарнікаў і укамплектаваньне фэрмы. Ударная работа калгаснікаў дала свае вынікі.

У сучасны момант, прадаўшы таварную прадукцыю дзяржаве, калгаснікі на справе пераканаліся, што спэцыялізаваная гаспадарка зьяўляецца даходнай і выгаднай для калгасу. Замест плянавых 2,5 тон, калгасам здана на загатоўках жыта 2,6 тоны на суму 235 рублёў, мяса 15,45 цэнтн. на суму 1059 руб., малака 8.800 літраў на суму 1056 руб., буракоў сталовых 257 цэнтн. — 1028 руб., памідораў 94,6 цэнтн. — 2366 руб., буракоў 361 цэнтн. — 3619 р., моркву на 3032 руб.

Гэтыя лічбы ярка сьведчаць аб высокай таварнасьці спэцыялізаванай гаспадаркі. Яшчэ раз на практыцы паказваюць правільнасьць лініі партыі ў справе калгаснага будаўніцтва, разьбіваючы ўшчэнт кулацкую хлусьню.

Калі ўвесь даход калгасу за гэты год у пераводзе на гропы складае 30.419 руб., дык з асноўных галін гаспадаркі (гародніцтва, жывёлагадоўля) у выглядзе таварнай прадукцыі атрымана на суму 15 тыс. рублёў, а з астатніх галін паляводзтва толькі 400 рублёў.

Лічбы паказваюць перавагу буйной калгаснай гаспадаркі над дробнай аднаасобнай гаспадаркай. Гераічнае змаганьне калгаснікаў за спэцыялізацыю гаспадаркі цалкам і поўнасьцю сабе апраўдала. Спэцыялізацыя і ўзбуйненьне далі магчымасьць давесьці таварную прадукцыю да 50% агульнага даходу калгасу.

Я. Прахарэнка.

## 50 чал. на дапамогу калгасам

ДУБРОЎНА. (Наш кар.). Для выпраўленьня дапушчаных памылак у выдачы авансаў і правядзеньня правільнага разьмеркаваньня даходаў у калгасах, на якую павінны былі зьявіцца рахункаводы і настаўнікі 3-х сельскіх саветаў.

Для правядзеньня нарады з райцэнтру прыехалі з прадстаўнікі: Грудавік, Дрозд і Красноў. Але нажаль, акрамя «начальства» ніхто больш не зьявіўся... бо галавацяпы з райкалгасасоюзу і МТС забылі даслаць паведамленьні.

Нараду адклалі на 9-га кастрычніка. На гэты раз усе рахункаводы і настаўнікі былі ў зборы. Але... зноў недарэчнасьць. Плінская хата-чытальня, дзе павінна была адбыцца нарада аказалася на замку. Звоняць у раён... там забыліся, што склікана нарада.

Неабходна прыцягнуць да суровай адказнасьці галавацяпаў Вушацкага райкалгасасоюзу, якія ігнаруюць і недаацэньваюць палітычнага значэньня разьмеркаваньня даходаў у калгасах.

Ліпаўка, Гінзбург

## Да адказнасьці галавацяпаў

ВУШАЧЫ (наш кар.) На 4-га кастрычніка ў Плінскім сельсавеце была назначана куставая нарада па пытаньні разьмеркаваньня даходаў у калгасах, на якую павінны былі зьявіцца рахункаводы і настаўнікі 3-х сельскіх саветаў.

Для правядзеньня нарады з райцэнтру прыехалі з прадстаўнікі: Грудавік, Дрозд і Красноў. Але нажаль, акрамя «начальства» ніхто больш не зьявіўся... бо галавацяпы з райкалгасасоюзу і МТС забылі даслаць паведамленьні.

Нараду адклалі на 9-га кастрычніка.

## Раўняцца па перадавых

Пабудаваць 21 сьвінарнік, столькі-ж абораў, 4 цялятнікі, 4 птушнікі і своячасова ўкамплектаваць іх — вось праграма работы саўгасаў і калгасаў Магілеўскага раёну, якая павінна быць праведзена на працягу бягучага месяца. Пляны будаўніцтва і ўкамплектаваньне таварных фэрм у значнай ступені залежаць ад таго, наколькі паасобныя сельпарткомы і ячэйкі будуць арганізоўваць і кіраваць работай па разгортваньні сацыялістычнай жывёлагадоўлі.

У тых сельсаветах і калгасах Магілеўшчыны, дзе партыйныя ячэйкі павярнуліся тварам да калгаснай вытворчасьці, апэрацыйна і канкрэтна кіравалі ёю, калгасы паказвалі ўзоры барацьбы за датэрміновае выкананьне пляну жывёлагадоўлі.

Так, у калгасе «Чырвоны сормавец» пасьля распрацоўкі адозвы ЦК і СНК аб разьвіцьці жывёлагадоўлі калгаснікі ўзялі на сябе канкрэтныя абавязацельствы па рэалізацыі гэтай адозвы. У «Чырвоным сормаўцы» датэрмінова закончана будаўніцтва аборы, МТФ поўнасьцю ўкамплектавана. Плян сіласаваньня выканан. З мэтай забясьпечыць добра догляд жывёлы на зімовы час у калгасе вылучаны для абслугоўваньня скотных двароў спэцыяльныя брыгады. Ударныя тэмпы будаўніцтва і ўкамплектаваньня ёсьць і ў радзе іншых калгасаў раёну (калгас «Колас» і інш.).

У тых калгасах, дзе партыйныя ячэйкі ігнаруюць дырэктыву партыі аб арганізацыйна - гаспадарчым умацаваньні калгасаў, тэмпы разгортваньня жывёлагадоўлі далёка невыстарчальныя У калгасах «Пераможца», імя Будзённага, «Чырвонаармеец», імя Валадарскага і інш. яшчэ дагэтуль не прыступілі да пабудовы абораў, якія павінны былі быць пабудаваны да 1-га кастрычніка г. г.

У радзе калгасаў адмаўляюцца ад пабудовы сьвінарнікаў. Такое становішча мае месца ў калгасе «Каміньтэрн», старшыня якога заявіў, што «сьвінямы займаца ня будзем». Па такіх настроях трэба біць з усёй рашучасьцю.

Вельмі дрэнна стаіць справа ў Магілеўскім раёне са стварэньнем кармовай базы. Плян сіласаваньня выканан толькі на 20 проц. Ня гледзячы на тое, што ў мінулым годзе на Магілеўшчыне быў недасеў кармовых траў на 53 проц., большасьць калгасаў нічога не зрабіла для таго, каб забясьпечыць сябе насеньнем кармовых траў

Недахопы, якія маюць месца ў разгортваньні жывёлагадоўлі па Магілеўскім раёне, павінны быць неадкладна ліквідаваны. Для гэтага ёсьць усе магчымасьці. Трэба толькі, каб кожны сельпартком і партыйная ячэйка перабудавалі сваю работу па-новаму.

К.

## Горацкі прафсаюз чакае вясны

ГОРКІ. (Наш. кар.). Недалёка ад мястэчка імя Леніна знаходзіцца торфараспрацоўкі, якія падпарадкаваны райпрамсаюзу. На распрацоўках валяецца каля 300 кубамэтраў торфу.

Райпрамсаюз не клапаціцца аб вывазе яго на месцы прызначэньня, хаці для гэтага ёсьць усе магчымасьці.

Я. К.

## Урэўнілаўка яшчэ не дабіта

ЛЕПЕЛЬ. (Наш спэцкор.).

Дырэктыва НКЗ і Белкалгасцэнтру абавязвала ўсе райкалгасасоюзы зрабіць папярэдні падлік працадзён і даходаў і правесьці выдачу першай паловы ўраджаю да 15 кастрычніка. Лепельскі райкалгасасоюз ігнаруе гэту дырэктыву, устанавіў свой тэрмін — 30 кастрычніка. Па большасьці калгасаў растлумачальная работа сярод шырокіх мас аб прынцыпах разьмеркаваньня даходаў не праведзена. У калгасах «Чырвоны прамень», «Усход», «Зарэва», «Ізабелі» разьмеркаваньне праводзіцца вузка канцылярскім парадкам, бяз удзелу калгаснікаў.

Насьцянгазэты стаяць у баку ад такой важнейшай палітычнай кампаніі, як разьмеркаваньне калгасных даходаў.

Раённая газэта «Калгасная праўда» нават ні аднаго радка не прысьвячае разьмеркаваньню, лічачы, што гэта другараднае пытаньне.

У шмат якіх калгасах, як, напрыклад «Ізабелі» і інш., ня ведаюць як практычна прыступіць да разьмеркаваньня даходаў. Рахункавод тэтага калгасу заявіў, што немагчыма ўлічыць прадуктовую частку даходу, пакуль не абмалочан увесь ураджай і ня ўбрана бульба.

Усё гэта стварае добрую глебу для ўраўнілаўкі. Авансы па радзе калгасаў выдаюцца бяз усякага ўліку хто колькі выпрацаваў, а проста бяруцца той ці іншы прадукт і разьмяркоўваецца ўсім па-роўні. У калгасе «Чырвоны прамень» выдалі масла па 1 кгр. на кожную душу, у калгасе «Ізабелі» таксама выдаецца паёд хлеба на 1-2 пуды на душу. Ня дзіва, што гэтыя калгасы маюць вялізарныя прарывы ва ўборцы і сяўбе жыта, бо ўдарнікі не заахвочваюцца, а наадварот — за кошт ударнікаў забясьпечваюцца культаі.

Першыя тэрміны, устаноўленыя вышэйшымі органамі ў Лепельшчыне правалены. 50-75% даходу сярод калгаснікаў не разьмеркавана. Патрэбна найхутчэйшая мабілізацыя ўсіх раённых арганізацый і калгаснага актыву па ліквідацыю прарыву. Даць бой апартуністам, якія недаацэньваюць палітычнага значэньня разьмеркаваньня калгасных даходаў.

П. А.

## У Капылі чакаюць... устаноўкі

Капыль. Да разьмеркаваньня ўраджаю і даходаў у калгасах яшчэ не прыступілі. На запытаньне: «Чым тлумачыцца такая марудна́сьць?» агранам МТС Кароль адказаў: «чакаем устаноўкі і трэба дагаварыцца з праўленьнем райкалгасасоюзу.»

Пакуль МТС вядзе перагаворы з Райкалгасасоюзам некаторыя калгасы пачалі разьмяркоўваць ураджай не па працаднёх, а па дварох. Так калгас імя «Вашышлава» выдаў на кожную сям'ю бяз уліку працаздзён ад 8 да 32-х клг. жыта, калгас «Бальшавік» ад 1 да 2-х цэнт. на сям'ю і г. д.

Гэтыя факты сьведчаць, што дзякуючы апартуністычнай бязьдзейнасьці райкалгасасоюзу разьмеркаваньне даходаў па працаднёх у капыльскім раёне зрываецца. Слова за Белкалгасцэнтрам.

А.

## 4 паравозы і 8 вагонаў

### у падарунак 14-й гадавіне кастрычніцкай рэвалюцыі

### На загад тав. Андрэева гомельскія чыгуначнікі адказваюць новай хваляй энтузіязму

Пад кіраўніцтвам партыйных і прафсаюзных арганізацый гомельскія паравозныя эмагацуда па-бальшавіцку за стопроцантнае ажыцьцяўленьне і замацаваньне спаранай ясды. У жніўні на машыністах спараная была ажыцьцяўлена на 97 проц., на памочніках—на 95,3 проц., качагарах—на 96,2 проц., а ў верасьні: на машыністах—на 98,5 проц. на памочніках—на 96,9 проц. і толькі па качагарах ёсьць некаторае выжыжэньне.

На гомельскім дэпо 67 лепшых паравозных ударнікаў далі лепшыя паказальнікі выканаьня вымяральнікаў. Брыгады Дзянісава, Трушынскага і Варсанова выканалі трансфіплян па абработку паравозаў на 122 проц. Брыгады Пожывейка і Дапінава выканалі трансфіплян на 145 проц. Гэта брыгада выцукае ў сябе на паравозе насьцентазэту.

Тры ударныя брыгады — тэндэрная, дышлавая і кацельная ў колькасьці 14 ударнікаў паказалі лепшыя ўзоры работы.

Праграма па выпуску паравозаў з абточкі павялічана сустрэчным заданьнем на адзін паравоз. Раней паравоз з абточкі выпускаўся праз 12 дзён, а зараз выпускаецца праз 3-4 дні. Гэтыя брыгады пятуць на буксіры брыгады экіпажную і парнпавую.

На заводзе імя Ланцуцкага арганізавана 198 ударных брыгад, у якіх нацяжаецца 1728 ударнікаў. На ліцейным цэху, брыгада з 21 ударніка, пад кіраўніцтвам брыгадзіра т. Шчарбакова, дабілася значных посьпехаў у выкананьні вымяральнікаў. Брыгада сваёй арганізацыяю і энтузіязмам паслужыла прыкладам для другіх. Брыгада тав. Праскурава з 12 ударнікаў пабудавала арганізацыйную работу па прыкладзе брыгады Шчарбакова. Ударная харобіцкая брыгада тав. Буксанава па раёне арганізавала 26 брыгад. Гэта брыгада мяняе 31-33 шпалы на чалавека ў дзень—перавыконвае заданьне на 90 проц., зьнікла сабекошт на 50 проц. Сакрэт посьпеху харобіцкай брыгады ў правільнай расстаноўцы рабочай сілы. На пляцовым рамонце шляху арганізавалася брыгада імя тав. Сталіна з 11 ударнікаў пад кіраўніцтвам інжынэра —тав. Ведзь.

Гомельскі вузел узмоцнена рыхтуецца да XIУ гадавіны Кастрычніцкай рэвалюцыі. На дэпо рабочыя ўзялі на сябе абавязкі ў падарунак Кастрычніцкай рэвалюцыі выпусьціць 7 вагонаў сышы пляну. Рабочыя дэпо—Гомель-гасадарчы абавязаліся адрамантаваць тры паравозы звыш праграмы, а на заводзе імя Ланцуцкага выпускаецца звыш пляну паравоз і адзін пасажырскі вагон (14-мэтравы). Рабочымі Гомельскага раёну за пэрыяд з 1 студзеня па 1 верасьня 1931 году ўнесена 204 рабочых рацыяналізатарскіх прапановы, з якіх ужо ўкалена 116. Апошнія даюць гадавую эканомію ў 15.000 руб.

Лепшы ўдарнік Віцебскага дэпо тав. Александровіч.

Рабочы тав. Еўстаф'еў па майстэрнях шляху Гомель унёс да 20 рабочых рацыяналізатарскіх прапаноў, якія даюць эканамічны эфэкт у дзесятках тысяч рублёў.

Тав. Еўстаф'еў прадстаўлен да ўзнагароды ордэнам Леніна.

Работнік раёну тав. Жываў унёс рацыяналізатарскую прапанову па пагрузцы лесу, якая дае эканамічны эфэкт у год у суме 100 тыс. руб. Але побач з дасягненьнямі на вузьле ёсьць рад сур'ёзных недахопаў.

Надзвычай дрэнна стаіць справа з адпраўкай цытлікоў паводле раскладу.

З дысцыплінай таксама ня ўсё добра. За чэрвень месяц па Гомельскім раёне было 439 прагулаў, за ліпень—390, за жнівень—418. На заводзе імя Ланцуцкага за чэрвень было 286 прагулаў, за ліпень—211, жнівень—302. Зараз па вузьле разгорнут месячнік барацьбы за працоўную дысцыпліну.

З 15 верасьня па дэпо—Гомель-гасадарчы паступіла 12 заяў ад лепшых ударнікаў аб прыняцьці іх у рады партыі. Паравозьнікі арганізавалі кантрольны пост з 7 чалавек, якія вывучаюць прычыны парушэньня працоўнай дысцыпліны. Таварыскія суды разгарнулі сваю работу. На мясцкоме № 6 арганізавана з брыгады па праверцы працоўнай дысцыпліны начных зьмен. Работа брыгады абгаварваецца ў зьменах і асьвятляецца ў насьцентазэтах.

Клюб імя Леніна, які доўга бязьдзейнічаў, пазьвярнуўся «тварам да вытворчасьці»; арганізаваны вылазкі агітбрыгады. Клюб прыступае да арганізацыі вечара сустрэчы лепшых і горшых брыгад па абгаварэньні сваіх дасягненьняў і недахопаў. Месячнік барацьбы за ўзмацненьне працоўнай дысцыпліны яшчэ ня скончан.

Н. Ладырда.

## Да адказнасьці зрыўшчыкаў асеньня-зімовых перавозак

БАБРУЙСК. Асеньня-зімовыя перавозкі па ст. Бабруйск праходзяць нездавальняюча. Плян перавозак ня выконваецца. Мясцовая кліентура часта зьмяняе свае заяўкі. Саюзхлеб мяняў сваю заяўку чатыры разы, у выніку рабсіла для пагрузачна-разгрузачных работ заставалася нескарыстанай. Грузы закупляюцца і вывозяцца мясцовай кліентурай несвоячасова. На станцыі гніюць 12 вагонаў яблык, якія належаць фабрыцы «Чырвоны харчавік». Саспаборніцтва і ўдарніцтва ўжываюцца фармальна. Культмасавая работа разгорнута слаба, нават няма лепіскага кутка.

Такое становішча зьяўляецца вынікам слабой і невыстарчальнай работы партыйна-камсамольскіх і прафсаюзных арганізацый станцыі. (Белта).

## 22 ударнікі ўступаюць у партыю

14-ГА КАСТРЫЧНІКА АДБЫЎСЯ ЎРАЧЫСТЫ СХОД РАБОЧЫХ МАГІЛЕЎСКАГА ДЭПО, ПРЫСЬВЕЧАНЫ ПЕРАДАЧЫ РАЁННАГА ПЕРАХОДНАГА СЬЦЯГУ ЗА ПАСЬПЯХОВАЕ ВЫКАНАНЬНЕ І ПЕРАВЫКАНАНЬНЕ ВЫМЯРАЛЬНІКАЎ.

НА СХОДЗЕ 22 ЛЕПШЫХ УДАРНІКАЎ ПАДАЛІ ЗАЯВЫ АБ ПРЫЁМЕ Ў ПАРТЫЮ.

Я. СМАЛЬ.

УБОРКА БУЛЬБЫ

## РАЎНЯЮЧЫСЯ ПА ЛЕЗЬНЕ, РАСОНАХ І АСЬВЕІ, скончыць уборку бульбы ў бліжэйшыя-ж дні

### ЯШЧЭ ВЫШЭЙ ТЭМПЫ

Паводле даных Наркамзему, на 15 кастрычніка па БССР было ўбрана ўсяго 63,2 проц. засеянай плошчы бульбы. За пяцідзённую з 10 па 15 кастрычніка выка на на 16,7 проц. агульнага пляну. Тэмпы яўна нездавальняючыя. На 15 кастрычніка ўборка павінна была быць ужо поўнасьцю скончана.

Тры раёны— ЛЁЗЬНЯНСКІ, РАСОНСКІ І АСЬВЕЙСКІ—якія з самага пачатку па-баявому ўключыліся ва ўборку бульбы, на 15 кастрычніка поўнасьцю СКОНЧЫЛІ яе.

Набліжаюцца да скончэньня ўборкі: ЧЫРВОНАПОЛЬСКІ раён, які выканаў 92,8 проц. пляну ЧЫРВОНАСЛАБОДСКІ —97,8 проц., БЯГОМЛЬСКІ—91,5 проц., ПОЛАЦКІ—91,3 проц., МАГІЛЕЎСКІ—89,7 проц., МЕНСКІ—84,5 проц., ПУХАВІЦКІ—85,3 проц., ЧЭРВЕНЬСКІ—82,3 проц., ШКЛОЎСКІ—85,1 проц., ВУЗЬДЗЕНСКІ—98,9 проц., КРУПСКІ—83,4 проц., КЛІЧАЎСКІ—82,7 проц., ЦЕРАХАЎСКІ—84,4 проц., ТУРАЎСКІ—84,4 проц., РАГАЧОЎСКІ—84,7 проц., ЛЕЛЬЧЫЦКІ—89,7 проц., ЖЫТКАВІЦКІ—84,4 проц.

Рэшта раёнаў адстала ў тэмпах уборкі прычым частка раёнаў ганебна пляцецца ў хвасьце. Да гэтых раёнаў адносяцца ВЕТКАЎСКІ—48,7 проц. заданьня, ГЛУСКІ—42,3 проц., КАМАРЫНСКІ—47,2 проц., НАРАЎЛЯНСКІ—31,9 проц., ЧАЧЭРСКІ—39,8 проц., УВАРАВІЦКІ—47,5 проц., ХОЙНІЦКІ—29,8 про

СЁНЬНЯ АДКРЫВАЕЦЦА III УСЕБЕЛАРУСКІ ЗЬЕЗД НАВУКОВЫХ РАБОТНІКАЎ

# КАЛІ ВЫВУЧЫМ ТЭХНІКУ І АУЛАДАЕМ НАВУКАЮ...

„...тады ў нас пойдуць такія тэмпы, аб якіх зараз мы не адважваемся і марыць. І мы гэта зробім калі захочам гэтага па-сапраўднаму" (СТАЛІН)

## ГАРАЧАЕ ПРЫВІТАНЬНЕ ДЭЛЕГАТАМ ЗЬЕЗДУ І У ІХ АСОБЕ УСІМ ТЫМ НАВУКОВЫМ РАБОТНІКАМ САВЕЦКАЙ БЕЛАРУСІ, ЯКІЯ РАЗАМ З РАБОЧАЙ КЛЯСАЙ, ПАД КІРАЎНІЦТВАМ БАЛЬШАВІЦКАЙ ПАРТЫІ, АДДАНА ЗМАГАЮЦЦА НА ПЕРАДАВЫХ ЛІНІЯХ САЦЫЯЛІСТЫЧНАГА БУДАЎНІЦТВА

«Гаворыць, што цяжка аўладаць тэхнікай. Няправільна! Няма такіх вышынь, якія-б бальшавікі не маглі ўзяць. Мы вырашылі рад цяжэйшых задач. Мы зьверглі капіталізм. Мы ўзялі ўладу. Мы пабудавалі буйнейшую сацыялістычную індустрыю. Мы павярнулі серадняка на шлях сацыялізму. Самае важнае з пункту гледжаньня будаўніцтва мы ўжо зрабілі. Нам засталося нямнога. Вывучыўшы тэхніку—аўладаць навукай. Калі мы зробім гэта, тады ў нас пойдуць такія тэмпы, аб якіх зараз мы не адважваемся і марыць. І мы гэта зробім, калі захочам гэтага па-сапраўднаму!» (СТАЛІН).

У барацьбе за высокія тэмпы сацыялістычнага будаўніцтва, за ажыцьцяўленьне ленінскіх прынцыпаў нацыянальнай палітыкі, працоўныя масы БССР пад кіраўніцтвам КП(б)Б дабіліся вялікіх перамог, як на гаспадарчым, так і на культурным фронце.

Трэці зьезд навуковых работнікаў БССР, які сёньня адкрываецца, зьяўляецца адным з яркіх паказальнікаў гэтых перамог. Калі да 2-га зьезду ў БССР налічвалася чатыры ВНУ і сем НДУ, дык зараз мы маем 26 ВНУ і 39 навукова-дасьледчых устаноў. За час ад 2 да 3-га зьезду сэкцыя навуковых работнікаў БССР патроіла свае рады і налічвае зараз 1156 чалавек.

Кадры навуковых работнікаў вырасьлі НЯ ТОЛЬКІ колькасна, але, што надзвычай важна, ПАВЫСІЛАСЯ ТАК САМА І ІХ ЯКАСЬЦЬ:

НОВЫЯ ЎМОВЫ, НОВЫЯ АБСТАВІНЫ САЦЫЯЛІСТЫЧНАГА БУДАЎНІЦТВА АБУМОВІЛІ РАШУЧЫ ПАВАРОТ ПЕРАВАЖНАЙ ЧАСТКІ НАВУКОВЫХ РАБОТНІКАЎ У БОК АКТЫЎНАГА ЎДЗЕЛУ Ў САЦЫЯЛІСТЫЧНЫМ БУДАЎНІЦТВЕ.

За апошнія гады ў БССР праведзена вялікая работа па выкрыцьці чужых пралетарыяту ідэй і тэорый, якімі былі засьмечаны паасобныя навуковыя работы. Саправы маскі з буржуазных вучоных, якія прыкрываючыся «бяспрыналежнасьцю», а часам адкрыта прапагандавалі нацыянал-дэмакратычныя, вялікадзяржаўніцкія, кандрацьцеўскія і іншыя антыпралетарскія ідэі і тэорыі.

АСНОЎНЫЯ МАСЫ НАВУКОВЫХ РАБОТНІКАЎ ПАД КІРАЎНІЦТВАМ ПАРТЫІ НАНЕСЬЛІ РАШУЧЫ ЎДАР ГЭТЫМ ВАРОЖЫМ ПРАЯВАМ І Ў СВАЕЙ ШТОДЗЕННАЙ РАБОЦЕ ЎПАРТА ЗМАГАЮЦЦА ЗА ПОЎНАЕ АЎЛАДАНЬНЕ МАРКСЫЦКА-ЛЕНІНСКАЙ МЭТАДАЛЁГІЯЙ, ЗА САЦЫЯЛІЗМ.

Стараючы ЎСЕ НЕАБХОДНЫЯ ЎМОВЫ для работы АДДАНЫХ савецкай уладзе навуковых працаўнікоў, дапамагаючы тым з іх, хто яшчэ ня прышоў «да правільнага ўсьведамленьня марксыцка-ленінскага навуковага мэтаду», трэба і надалей ВЕСЬЦІ РАШУЧУЮ БАРАЦЬБУ З УСЯКІМІ ІМКНЕНЬНЯМІ ПРАЦЯГНУЦЬ У НАВУКУ ЧУЖЫЯ ПРАЛЕТАРЫЯТУ ІДЭІ.

Разам з тым, неабходна рашуча змагацца з усякімі ПЕРАГІБАМІ ў крытыцы.

ПАТРЭБНА ІДЭАЛЁГІЧНУЮ БАРАЦЬБУ, КРЫТЫКУ ПАМЫЛАК НАВУКОВЫХ РАБОТНІКАЎ ПАСТАВІЦЬ ТАК, КАБ «НЯ ТОЛЬКІ НЕ АДШТУРХОЎВАЮЦЬ, А ЎСЕ БОЛЬШ ЗАВАЁВАЦЬ НА СВОЙ БОК САПРАЎДНЫХ РАБОТНІКАЎ НАВУКІ І ТЭХНІКІ, КАБ ЗАХОЎВАЦЬ ТАВАРЫСКІЯ ФОРМЫ Ў ГЭТАЙ КРЫТЫЦЫ І Ў АДНОСІНАХ ДА ТЫХ СПЭЦЫЯЛІСТАЎ, ЯКІЯ З ПОСЬПЕХАМ ПРАЦУЮЧЫ У ТЭЙ ЦІ ІНШАЙ ГАЛІНЕ НЯ ПРЫШЛІ ЯШЧЭ ДА ПРАВІЛЬНАГА ЎСЬВЕДАМЛЕНЬНЯ МАРКСЫЦКА-ЛЕНІНСКАГА НАВУКОВАГА МЭТАДУ». (Молатаў).

Зьезд навуковых работнікаў павінен прайсьці пад знакам ПАГЛЫБЛЕНЬНЯ БАРАЦЬБЫ ЗА ПАРТЫЙНАСЬЦЬ У НАВУЦЫ, за ўкараненьне мэтадаў сацспаборніцтва і ўдарніцтва ў сыстэму навуковай работы, ЗА ХУТЧЭЙШУЮ ЛІКВІДАЦЫЮ АДСТАВАНЬНЯ навуковай думкі ад усё ўзрастаючых тэмпаў сацыялістычнага будаўніцтва, за САПРАЎДНЫ ПАВАРОТ тварам да вытворчасьці.

ПРЫВІТАНЬНЕ ТРЭЦЯМУ ЗЬЕЗДУ НАВУКОВЫХ РАБОТНІКАЎ БССР!

«Савецкая ўлада... адкрыла дзьверы вышэйшых навучальных устаноў па ўсіх галінах народнай гаспадаркі для людзей рабочае клясы... Дзесяткі тысяч рабоча-сялянскай моладзі вучыцца цяпер у вышэйшых навучальных установах. Калі раней пры капіталізьме, вышэйшыя навучальныя ўстановы зьяўляліся манаполіяй панічоў, то зараз, пры савецкім ладзе, рабоча-сялянская моладзь складае там пануючую сілу. Няма сумненьня, што мы атрымаем хутка з нашых навучальных устаноў тысячы новых тэхнікаў і інжынэраў, новых камандзіраў нашай прамысловасьці» (СТАЛІН).

*Е. РЫЎЛІН*

## Прамова тав. Сталіна і задачы ВНУ*)

Тав. Сталін у прамове, зробленай на нарадзе гаспадарнікаў, падкрэсьліў вялізарнае палітычнае значэньне, якое мае ў нашых умовах работа ВНУ. «Мы ня можам ужо абыходзіцца тым мінімумам інжынэрна-тэхнічных і камандных сіл прамысловасьці, якімі мы абыходзіліся раней... Нам патрэбна цяпер вабясьпечыць сябе ў тры, у пяць разоў больш інжынэрна-тэхнічнымі і камандными сіламі прамысловасьці, калі мы сапраўды думаем ажыцьцявіць праграму сацыялістычнай індустрыялізацыі СССР».

Гэтыя словы тав. Сталіна адносяцца зразумела ня толькі да інжынэрна-тэхнічных сіл, але таксама і да ўсіх кадраў у галіне асьветы, мэдыцыны, у галіне сельскай гаспадаркі, савецкага будаўніцтва і г. д. Ва ўсіх галінах нам патрэбна зараз «у тры разы, у пяць разоў больш сіл», чым патрэбна было раней.

— «Але, гаворыць далей тав. Сталін, нам патрэбны ня ўсякія камандныя і інжынэрна-тэхнічныя сілы. Нам патрэбны такія камандныя і інжынэрна-тэхнічныя сілы, якія здольны зразумець палітыку рабочай клясы нашай краіны, здольны ўсьвядоміць гэту палітыку, гатовы ажыцьцявіць яе сумленна. А што гэта значыць? Гэта значыць, што наша краіна ўступіла ў такую фазу разьвіцьця, калі рабочая кляса павінна стварыць сабе сваю ўласную вытворча-тэхнічную інтэлігенцыю, здольную абараніць яе інтарэсы ў вытворчасьці як інтарэсы пануючай клясы. Ні адна пануючая кляса не абыходзілася без сваёй уласнай інтэлігенцыі. Няма ніякіх падстаў сумняваецца ў тым, што рабочая кляса СССР таксама ня можа абыйсьціся без сваёй уласнай вытворча-тэхнічнай інтэлігенцыі».

І вось гэтая задача **стварэньня ўласнай інтэлігенцыі**, новай інтэлігенцыі рабочай клясы, **высунутая як адна з важнейшых і рашаючых у апошній прамове** тав. Сталіна і акрэсьлівае работу нашых ВНУ, **работу нашых ВТНУ**. Выкананьне гэтай задачы перш за ўсё кладзецца іменна на нашы Вузы. Тав. Сталін проста так і гаворыць: «Савецкая ўлада ўліч'ла гэту акалічнасьць і адчыніла дзьверы вышэйшых навучальных устаноў па ўсіх галінах народнай гаспадаркі для людзей рабочай клясы»... і далей: «Няма сумненьня ў тым, што мы атрымаем хутка з нашых навучальных устаноў новых тэхнікаў і інжынэраў, новых камандзіраў нашай прамысловасьці».

Вышэйшая асьвета мае за апошнія гады цэлы рад дасягненьняў, якія ствараюць усе магчымасьці для таго, каб задача, якая ўскладзена тав. Сталіным на нашы ВНУ і ВТНУ, была выканана.

Мы маем вялізарныя дасягненьні ў разьвіцьці вышэйшай школы ў Беларусі. Усяго тры гады таму назад на ўсёй Беларусі было тры ВУЗ'ы, створаныя ўжо ў час існаваньня савецкай улады. Зараз мы маем у адным толькі Менску 12 ВНУ і ВТНУ. Мы маем рад ВНУ у іншых гарадох Беларусі (Гомель—3 ВНУ, Віцебск—2, Магілеў, — два, ВНУ ў Горках).

Да нядаўняга часу нашы ВНУ рыхтавалі кадры галоўным чынам для культурнага, вярней культурна-бытавога фронту (пэдагогаў, дактароў), а таксама кадры для сельскай гаспадаркі. За апошні час мы маем пашырэньне сферы дзейнасьці нашых ВНУ. Яны рыхтуюць зараз кадры і для розных галін прамысловасьці. Даволі сказаць, што ў нас у Менску ёсьць зараз хэмікатэхналёгічны інстытут, будаўнічы, энэргетычны, у Гомелі машына-будаўнічы і г. д.

Мы маем вялізарнае паляпшэньне і ў адносінах ідэалёгічнага ўзроўню выкладаньня ў ВНУ. Зараз гучыць анекдотам, калі ўспамінаем усіх Пічэт, Жарынавых, Лёсікаў, Краскоўскіх і інш., якія парэвальна зусім нядаўна адыгрывалі відную ролю ў нашых ВНУ. Значна ўзмацнілася марксыцкая і партыйная праслойка сярод выкладчыкаў ВНУ. Марксысы займаюць у большасьці ВНУ, асабліва грамадзкіх, камандныя ідэалёгічныя вышыні.

### Якасьць — асноўнае зьвяно

Мы маем некаторыя дасягненьні і ў сэнсе паляпшэньня мэтадаў заняткаў, ліквідацыя лекцыйна-заліковага мэтаду, узмацненьне актыўных мэтадаў, хоць гэта пытаньне — пытаньне мэтаду заняткаў — усё яшчэ застаецца балючым месцам у работе ВНУ.

Але, ня гледзячы на ўсе гэтыя дасягненьні, мы павінны проста сказаць, што работа ВНУ і ВТНУ на сёньняшні дзень зьяўляецца нездавальняючай, не адпавядаючай тым задачам, якія высоўваюцца сучасным этапам сацыялістычнага будаўніцтва.

Найбольш слабым месцам у работе нашых ВНУ зьяўляецца зараз якасьць работы. У рашэньні ЦК УсеКП(б) аб масавай школе праблема якасьці работы высоўваецца як праблема, якая мае рашаючае значэньне. Асноўная задача масавай школы зьяўляецца зараз павышэньне абъёму ведаў, якія гэта школа дае, таксама і ў адносінах да вышэйшай школы асноўным зьвяном, за якое трэба ўхапіцца, зьяўляецца іменна якасьць работы і ў прыватнасьці абъёмы ведаў, якія даюць нашы ВНУ.

Мы значна пашырылі колькасьць студэнтаў ВНУ, выпускі ВНУ павялічваюцца з кожным годам. Мы павінны дабіцца таго, каб з кожным годам павышалася і якасьць выпускаемай імі прадукцыі. Мы ня створым новай інтэлігенцыі рабочай клясы, калі будзем выпускаць з ВУЗ'аў людзей з нізкім агульна-адукацыйным узроўнем, людзей, якія ня маюць элементарных палітычных ведаў, якія ня маюць сур'ёзных ведаў у галіне сваёй спэцыяльнасьці.

А трэба прызнаць, што ў адносінах якасьці прадукцыі нашы ВНУ кульгаюць, прычым вельмі часта кульгаюць нават на абедзьве нагі. Мы нярэдка выпускаем з ВНУ людзей проста элементарна-няпісьменных.

У гэтым вінавата перш за ўсё масавая школа, якая павінна навучыць элементарнай грамаце. Але калі некаторыя студэнты ня толькі прыходзяць, але і выходзяць з ВНУ, ня ведаючы самых простых рэчаў, дык гэта паказвае, што якасьць работы нашых ВНУ зусім нездавальняючая.

Нядаўна ў адной з нашых вышэйшых навучальных устаноў была праведзена невялічкая анкета для высьвятленьня агульна-адукацыйнага і палітычнага ўзроўню студэнтаў.

Гэта анкета выкрыла надзвычайна нізкі палітычны ўзровень студэнцтва, яна паказала, што значная частка студэнтаў вельмі дрэнна (калі мякка гаварыць) чытае газэты.

З 60 апрошаных студэнтаў, больш паловы не змаглі адказаць нават прыблізна на наступныя пытаньні: Колькі процантаў ахопілена калектывізацыяй у СССР, якія ўказаньні даў тав. Сталін у прамове на нарадзе гаспадарнікаў, у якім годзе заснаваны Камінтэрн, у якім годзе быў уведзены НЭП, якія партыі ўваходзяць у склад «нацыянальнага» ўраду Англыйчыны, хто зьяўляецца старшынёй СНК СССР і г. д.

Гэтыя вынікі праведзенай анкеты сьведчаць перш за ўсё аб надзвычайна нізкім палітычным узроўні сьведчаць аб тым, што значная частка студэнтаў ня чытае газэт, ці чытае іх вельмі дрэнна. Для таго, каб ня ведаць, хто зьяўляецца старшынёю СНК СССР, каб адказаць, што Сталінградзкі трактарны завод выпускае штодзенна 100.000, 25.000 альбо 6, 10 і г. д. трактараў, для таго, каб не змагчы адказаць на пытаньне, дзе будуецца аўтазавод, для таго, каб ня ведаць, што ў Гішпаніі адбылася рэвалюцыя, вынікам якой зьявілася зьяўжэньне манархіі — трэба ня менш як паўгода не глядзець у газэту.

У часе надыходзячых перавыбараў бюро ячэек мы павінны завастрыць на гэтым увагу, мы павінны паставіць перад партыйнымі арганізацыямі нашых ВНУ і ВТНУ ва ўсю шырыню пытаньне аб належнай пастаноўцы партыйнай асьветы. Гэта задача высунута зараз перад усёй партыяй, як важнейшая палітычная задача. На неабходнасьць рашучага пералому ў гэтай справе, на недапушчальнасьць меўшай месца недаацэнкі партвучобы было ўказана і ў прамове сакратара ЦК УсеКП(б) тав. Постышава і ў радзе перадавых артыкулаў ЦО нашай партыі «Правды» і ў пастанове бюро ЦК КП(б)Б.

Між тым у радзе ВНУ мы дагэтуль маем зусім нясур'ёзныя адносіны да справы партыйнай вучобы. Гурткі бягучай палітыкі, якія гады два назад працавалі і працавалі нядрэнна, у мінулым годзе ў радзе ВНУ і ВТНУ «влачили жалкое существование».

Мы павінны з самага пачатку навучальнага году разгарнуць поўнасьцю ва ўсіх ВНУ сетку партыйнай асьветы. Мы павінны ўцягнуць у гэту сетку ўсё наша студэнцтва. Прычым першай задачай мы павінны паставіць перад гурткамі бягучай палітыкі (як давяла практыка, гурткі — гэта лепшая найбольш прыстасаваная да спэцыфічных умоў ВНУ форма партыйнай асьветы)—гэта навучыць студэнтаў рэгулярна чытаць газэты. Гэта вельмі нязначнае патрабаваньне, гэта, так сказаць, праграма-мінімум, але пакуль мы гэтага не дабъемся, ня прыходзіцца гаварыць аб падняцьці палітычнага ўзроўню, студэнцтва, аб сапраўдным разуменьні імі палітыкі рабочай клясы.

Другая задача, якая павінна зараз стаяць у цэнтры ўвагі партыйных арганізацый ВНУ—гэта барацьба за рашучае павышэньне абъёму ведаў, якія даюць нашы ВНУ і ВТНУ.

Бясспрэчна, той факт, што таварышы, скончыўшыя нашу сямігодку, ФЗУ, ня маюць элементарнай пісьменнасьці, ня ведаюць геаграфію і г. д., сьведчыць аб нездавальняючай рабоце пачатковай і сярэдняй школы. Але было-б зусім недапушчальным, калі-б мы абмежаваліся спасылкай на масавую школу, а самі сядзелі, склаўшы рукі. Нашы ВНУ павінны самі весьці канкрэтную работу па падрыхтоўцы кадраў для саміх сябе; таварыць — «мы бярём тое, што нам даюць», чакаць пакуль да нас самі прыдуць кадры высокай якасьці — гэта зусім не падыходзіць для бальшавікоў.

### Падрыхтаваць кадры для ВНУ

Тав. Сталін на нарадзе гаспадарнікаў высунуў, як адну з задач, якія стаяць перад прамысловасьцю — правядзеньне арганізаванага набору рабочай сілы. Гэта ўказаньне зусім прыстасоўна і да нашых ВНУ. Мы павінны арганізавала набіраць і падрыхтоўваць для саміх сябе кадры.

Рэалізаваць указаньне тав. Сталіна аб арганізаваным наборы рабочай сілы на ўмовах ВНУ—гэта перш за ўсё паставіць добра работу рабочых факультэтаў, забясьпечыць поўнасьцю набор на рабфакі, дапускаць рабфакаўцаў у лябараторыі, забясьпечыць іх падручнікамі, дапамагчы ім у падборы выкладчыкаў, стварыць для іх магчыма лепшыя матар'яльныя ўмовы, сыстэматычна кіраваць імі.

Гэтыя сапатрабаваньні мы павінны прад'явіць кіраўнікам, партыйным арганізацыям ВНУ. Пара як след заняцца рабфакамі, інакш мы не атрымаем належнага складу студэнцтва.

Аднак, нельга выдумачыць надобраякасьнасьць работу ВНУ толькі тым, што яны маюць справу з невыстарчальна падрыхтаваным матар'ялам. Прычыну нездавальняючай якасьці прадукцыі ВНУ, трэба шукаць таксама ў цэлым радзе бушэйных недахопаў, якія ёсьць у рабоце саміх ВНУ. Гэтыя недахопы, а таксама шлях да іх ліквідацыі ўказаны ў тэй-жа прамове тав. Сталіна. Наўрадці хто-небудзь стане спрачацца, што важнейшай прычынай нездавальняючай якасьці работы ВНУ зьяўляюцца пануючыя там да гэтага часу абязьлічка і ўраўнілаўка. Наўрад-ці хто-небудзь стане спрачацца таксама супроць таго, што ўказаньні, даныя ў гэтай галіне тав. Сталіным, адносяцца да нашых навучальных устаноў ня менш, чым да гас падарчых прадпрыемстваў і што гэтыя ўказаньні даюць ключ да вырашэньня асноўных задач, якія стаяць перад ВНУ.

Абязьлічка ва ВНУ,—гэта калі кожны студэнт паасобку не адказвае за выкананьне заданьня, якое даручана групе. Такая абязьлічка квітнее ў нас у ВНУ самым пышным цьветам. У нас няма адказнасьці кожнага студэнта за даручаную яму работу; мы пераводзім з курса на курс усіх студэнтаў агулам, ня ўлічваючы пасьпяховасьці кожнага з іх. Гэта і ёсьць самая сапраўдная абязьлічка і ўраўнілаўка.

Мы павінны зараз паставіць гэтае пытаньне перад усімі навуковымі працаўнікамі, перад усімі студэнтамі. Мы павінны актыўны мэтад заняткаў ажыцьцяўляць так, каб ведаць кожнага студэнта, каб пры пераводзе з курсу на курс, пры выпуску строга ўзважвалася работа кожнага студэнта паасобку.

Калі студэнт ня мае элементарных ведаў і аказвае ў анкеце так, як аб гэтым вышэй сказана, мы ня можам пераводзіць яго на старэйшы курс, а тым больш выпускаць з ВНУ. «Але пры такім падыходзе нам прыдзецца фактычна прадоўжыць тэрмін навучаньня для значнай часткі студэнцтва» — пярэчаць некаторыя таварышы. Нічога падобнага. Калі-б на працягу году праваліся веды кожнага студэнта, калі-б прафэсары пры пераводзе з курсу на курс цьвёрда патрабавалі пэўнага мінімуму ведаў, у нас-бы зусім інакш працавалі і ня было-б такіх рэзультатаў, якія мы часта маем зараз. Трэба проста сказаць, што частка старых навуковых працаўнікоў на ўвядзеньне актыўных мэтадаў заняткаў, да якіх яны адносяліся нядбяызна, адказалі адмаўленьнем ад усякага ўліку ведаў кожнага студэнта.

Гэта было скрытай формай сабатажу актыўных мэтадаў, якая выявілася ў агульным пераводзе з курсу на курс. Нашы партыйныя арганізацыі, студэнцкія арганізацыі, камуністы—навуковыя працаўнікі не аказаліся пры гэтым на вышыні становішча, не завастрылі своечасова гэтага пытаньня.

### Выкараніць абязьлічку і ўраўнілаўку

Мы маем у ВНУ яркія праявы ўраўнілаўкі ў горшым сэнсе гэтага слова. Возьмем хаця-б работу брыгад. У мінулым годзе тут былі дапушчаны грубейшыя скажэньні, дыскрэдытаваўшыя гэты дасканалы мэтад работы. Хіба гэта не зьяўляецца ўраўнілаўкай, раўнешем на найбольш слабых, калі мы прымушалі студэнтаў у брыгадзе сумесна чытаць голасна, а тых, хто адмаўляўся чытаць голасна, абвяшчалі анархістамі, індывідуалістамі і г. д. Хіба гэта ні было найбольш школьным скажэньнем брыгаднага мэтаду працы? Мы ні ў якім выпадку не павінны раўняцца на найбольш слабых і атрымліваць тых, хто можа ісьці ўперад. Сьмешна прымушаць студэнтаў чытаць голасна.

Задача брыгад заключаецца ў тым, каб сумесна абмяркоўваць тыя ці іншыя пытаньні, сумесна прапрацоўваць найбольш цяжкія праблемы, нават чытаць найбольш цяжкія тэксты, кантраляць работу ўдзельнікаў брыгады і г. д. Калі так паставіць работу брыгад — яны прынясуць вялікую карысьць, калі-ж іх пераварыць у нучнёўскія брыгады для чыткі кніг, гэта нічога акрамя шкоды прынесьці ня зможа. Мы павінны ва што-б там ні стала забясьпечыць поўную добраахвотнасьць у фармаваньні брыгад, бяз гэтага нельга гаварыць аб ліквідацыі ўраўнілаўкі ва ВНУ.

З сказанага вышэй відаочна, што найбольш хворым месцам нашай вышэйшай школы зьяўляецца мэтодыка заняткаў. Мы ўсе згодны в тым, што трэба перайсьці на актыўны мэтад заняткаў, але няма літаральна двух дырэктараў ВНУ, якія-б адназначна разумелі гэты мэтад, няма двух ВНУ, якія-б праводзілі яго аднолькава. Некаторыя лічаць, што пры актыўным мэтадзе заняткаў абавязкова трэба сядзець разам і чытаць кнігу голасна (нават не брыгадай, а ўсёй групай — дадумаліся і да гэтага). Другія лічаць, і гэтае скажэньне актыўнага мэтаду найбольш распаўсюджана, што ўся або амаль уся самастойная работа студэнтаў павінна праходзіць пы прафэсары або асыстэнце, што студэнт ні на адну хвіліну не павінен заставацца без кансультанта. Фактычна ўся работа кансультанта зводзіцца да таго, што ён, у залежнасьці ад тэмпэрамэнта, або спакойна сядзіць і чытае газэту, або мяшае студэнтам час ад часу адрываючы іх ад работы сваёй кансультацыяй.

Такое скажэньне актыўнага мэтаду адымае зусім бясплодна вялікую колькасьць часу ў нашых навуковых работнікаў, абвастрае да крайняй ступені і без таго вялізарны недахоп у навуковых кадрах. Замест таго, каб прывучыць студэнтаў карыстацца справачнікамі, слоўнікамі, замест таго, каб прывучыць іх самых думаць над яякжім тэкстам—гэты мэтад прывучае іх да рэпэтытарства, алучае іх ад самастойнай работы. Між тым **увесь сэнс актыўнага мэтаду**, яго асноўная перавага ў паваўнаньні з лекцыйным мэтадам і заключаецца ў тым, каб **навучыць студэнтаў самастойна працаваць** над матар'ялам, а не насыўна яго ўспрымаць.

Задача мэтадычнага кіраўніцтва ВНУ зараз набывае вялізарнае значэньне. Трэба проста сказаць, што на сёньняшні дзень мэтадычнага кіраўніцтва ВНУ і асабліва ВТНУ няма і яны ў гэтых адносінах працуюць без руля і бяз ветрыл. Мы мелі ў некаторых нашых ВНУ праяву таго-жа «дзікалумнага пражэктэрства», якое асуджана ў пастановах ЦК УсеКП(б) аб масавай школе. Некаторыя ВНУ на працягу году па некалькі раз пераходзяць да новых мэтадаў, пазнаёмяцца на практыцы не праверанных. Мы мелі нават спробу а боку некаторых работнікаў мэтадкому НКА прымусіць ВНУ перайсьці на так званы «мэтад праектаў». Вывучыць багаты вопыт правядзеньня актыўных мэтадаў, які мы ўжо маем, знайсьці лепшыя формы яго прымяненьня ў адносінах да розных груп дысцыплін (грамадзкія навукі, прыродазнаўчыя, фізыка - матэматычныя і г. д.), дабіцца прымяненьня гэтых форм у нашых ВНУ—вось адна з важнейшых задач, якія стаяць перад НКА, якой даручана мэтадычнае кіраўніцтва ўсімі ВНУ.

Побач з гэтым мы павінны правесьці вялікую работу па ліквідацыі абязьлічкі і ўраўнілаўкі і ў кіраўніцтве ВНУ, ва ўсёй арганізацыі работы, у матар'яльным забясьпячэньні студэнцтва, у аплаце навуковых работнікаў.

У нас да гэтага часу ў большасьці ВНУ работа катэдраў знаходзіцца ў зусім хаатычным становішчы. Тут поўнасьцю панае абязьлічка. Кіраўнік катэдры ні за што не адказвае, не ўстанёўлены дакладна ні яго правы, ні яго абавязкі. Між тым, катэдра павінна стаць асноўным зьвяном у сыстэме ВНУ і кіраўнік катэдры павінен сапраўды адказваць за пастаноўку сваёй дысцыпліны, для чаго ў сваю чаргу ён павінен мець дакладныя і пэўныя правы.

Надзвычай характэрнай для ўраўнілаўскіх тэндэнцый, якія панавалі ў нашых ВНУ, зьяўляецца сыстэма аплаты навуковых работнікаў, якая існуе да гэтых час. У яе аснову пакладзен прынцып прагрэсыўнага... (прагрэсыўнага прэміраваньня — падумае чытач. Ніякога падобнага — якраз наадварот) паменшэньня аплаты за дадатковую нагрузку, якую нясе навуковы работнік. Калі за першую нагрузку ў 240 гадзін прафэсар атрымлівае стаўку ў 300 руб., дык за другую нагрузку ў тыя-ж 240 гадзін ён атрымлівае толькі 150 руб. У нашых ВНУ зусім не практыкуецца прэміраваньне лепшых ударнікаў. (Наогул ударніцкі рух і сацспаборніцтва вельмі мала закрануў нашых навуковых работнікаў, асабліва іх верхавіну). Такое-ж становішча мы маем і ў сыстэме забясьпячэньня студэнтаў. І тут сыстэма, якая існуе, не стварае стымула для лепшай работы і тут мы ня маем прэміраваньня, перпачарговага спажэньня ўдарнікаў і г. д. Адной з важнейшых задач надыходзячага зьезду навуковых работнікаў, партыйных і студэнцкіх арганізацый ВНУ зьяўляецца распрацоўка і ажыцьцяўленьне канкрэтных мерапрыемстваў, якія дабілі-б абязьлічку і ўраўнілаўку ва ўсіх іх правах.

### Змагацца за партыйнасьць у навуцы

Барацьба за якасьць работы ВНУ зможа быць пасьпяховай толькі ў тым выпадку, калі мы забясьпечым у іх марксыцка-вытрыманае выкладаньне. Без гэтага нашыя ВНУ, натуральна, ня зможуць стварыць новай інтэлігенцыі рабочай клясы. Трэба сказаць, што ня гледзячы на бясспрэчныя дасягненьні, тое становішча, якое мы зараз маем, нас задаволіць ніяк ня можа. Многія нашы навуковыя работнікі ня раз горача бяруцца за вывучэньне дыялектычнага матар'ялізму, тэарытычнай эканомікі і г. д., але вельмі нямногія даводзяць работу да канца, вельмі нямногія сыстэматычна працуюць над аўладаньнем марксізмам-ленінізмам. Між тым, бы доўгай і сыстэматычнай работы марксызмам аўладаць нельга.

На жаль, і работа, якая вядзецца ў гэтых адносінах сэкцыяй навуковых работнікаў, зьяўляецца далёка невыстарчальнай і што асабліва трэба адначаньць — камуністы — навуковыя работнікі часта недаацэньваюць усёй важнасьці гэтай работы. Між тым, у пастанове ЦК КП(б)Б ад 21 верасьня ўказваецца на «неабходнасьць сур'ёзнай пастаноўкі справы ўзбраеньня марксыцка-ленінскай ідэалёгіяй і палітычнага выхаваньня беспартыйных навуковых работнікаў і зварачаецца ўвага камуністаў-навуковых работнікаў на неабходнасьць іх шырокага ўдзелу ў практычнай рабоце сэкцыі навуковых работнікаў, ВАРНІТСО і інш. арганізацый, якія павінны ажыцьцявіць гэту задачу». Ажыцьцяўленьне гэтай дырэктывы КП(б) зьяўляецца адным з істотных моментаў у барацьбе за якасьць работы ВНУ.

Мы павінны дабіцца большага ўцягненьня масы навуковых работнікаў і масы студэнтаў у ідэалёгічную барацьбу, барацьбу за **партыйнасьць у навуцы**. Трэба сказаць, проста, што да гэтага часу важнейшыя дыскусіі, якія адыгралі вялізарную ролю ў барацьбе на ідэалёгічным фронце (барацьба з рубінштынай, дэборынштынай, пераверзеўшчынай і г. д.) або зусім праходзілі міма нашых ВНУ або апошнія ўцягваліся ў іх толькі з вялікім спазьненьнем. Даволі сказаць, што калі нядаўна быў зроблен даклад на сходзе студэнтаў Вышэйшага Пэдагагічнага Інстытуту аб пастанове ЦК аб масавай школе, высьвятлілася, што студэнты, якія канчаюць пэдінстытут, ня маюць узьленьня аб пэдагагічнай дыскусіі і барацьбе на два фронты, якую партыя вядзе.

**Мы павінны дабіцца тут пералому, дабіцца большай палітычнай актыўнасьці нашых ВНУ.**

Толькі бесьперапынна вядучы барацьбу за партыйнасьць у навуцы, толькі вядучы барацьбу з усякімі канкрэтнымі праявамі ідэалізму, мэханізму, эклектызму і г. д., — нашыя ВНУ здолеюць выканаць тую ганарэўую задачу, якая пастаўлена перад імі ў прамове тав. Сталіна — задачу стварэньня «новай інтэлігенцыі рабочай клясы».

*А. Я. Пракапчук*

## Растуць якасна і колькасна кадры навуковых работнікаў БССР

Пачатак падрыхтоўкі навуковых кадраў БССР трэба лічыць са дня выгнаньня белапалякаў і адкрыцьця Беларускага Дзяржаўнага Унівэрсытэту.

11 ліпеня 1921 г. адкрыўся Беларускі Дзяржаўны Унівэрсытэт з трыма факультэтамі: рабочым, мэдыцынскім і 4-ма аддзяленьнямі факультэту грамадзкіх навук. Беларускі Дзяржаўны Унівэрсытэт налічваў у 1921 г. 1535 студэнтаў і 78 навуковых працаўнікоў.

За 10 год БССР узбагацілася радам буйных фабрык і заводаў. Бурна расьце сацыялістычны сэктар вёскі, а разам з гэтым значна пашырылася сетка ВНУ і НДІ. Асаблівы рост культурных устаноў пачаўся з 1929 і 30 гадоў.

Да 1 мая 1931 году 37 навуковых пунктаў аб'ядналі ўжо 1.101 чал. навуковых працаўнікоў.

Па навуковай кваліфікацыі наяўны лік навуковых работнікаў распадзецца на наступным чынам: акадэмікаў 23, прафэсароў 85, дацэнтаў 173, вучоных спэцыялістаў 102, асыстэнтаў 216, навуковых супрацоўнікаў 259, асьпірантаў 243.

Трэба адзначыць, што гэта лічба 1101 навуковых працаўнікоў не задавальняе патрэб на навуковую сілу і зараз нам неабходна для запаўненьня кадраў і інстытутаў БССР каля 350 навуковых працаўнікоў.

У складзе гэтых навуковых працаўнікоў разам з беспартыйнымі, членаў КП(б)Б і кандыдатаў — 300 чал. — 27 проц. Членаў ЛКСМБ — 29 чал.

Партыйная праслойка сярод навуковых працаўнікоў СССР па даных 1929 году складае — 6,3 проц. Трэба сказаць, што ў БССР у 1929-30 г. партыйная праслойка сярод навуковых працаўнікоў складала 13 проц.

Павялічэньне партыйнага ядра сярод навуковых працаўнікоў на БССР да 27 проц. у 1931 г. атрымалася дзякуючы адпаведным мерам ЦК КП(б)Б і найшло, галоўным чынам, па лініі асьпірантуры.

Сацыяльны склад навуковых працаўнікоў далёка яшчэ ад таго, каб мы маглі быць ім задаволены. Мы маем рабочых — 7,1 проц., сялян — 34,6 проц., служачых — 48,5 проц., выхадцаў з чужых праслоек — 19,2 проц.

Сацыяльны склад вышэйшых катэгорый прафэсараў і дацэнтаў яшчэ больш дрэнны: сярод прафэсароў мы маем выхадцаў з рабочых 2,9 проц., сялян 17,2 проц. служачых 61,5 проц., з чужых праслоек 18,4 проц.

Параўнальна з 1929-30 годам, дзякуючы прынятым ЦК КП(б)Б мерам праслойка рабочых сярод асьпірантаў павялічылася з 14 проц. да 20 проц., але процант рабочых усё-ж нязначны. Якасному паляпшэньню сацыяльнага складу асьпірантуры таксама даламог лепшы ў гэтым годзе адбор асьпірантаў. Арганізацыя інстытуту асьпірантуры таксама ўзмацніла ідэалёгічнае і мэтадалёгічнае кіраўніцтва асьпірантурай, але на жаль, практычная работа асьпірантаў, работа іх у лябараторыі і кіраўніцтва з боку прафэсуры па некаторых спэцыяльнасьцях невыстарчальнае. Бліжэйшыя гады патрабуюць яшчэ большага вылучэньня асьпірантаў. Гэтых 243 так мала, калі мы ўспомнім, што к канцу пяцігодкі нам патрэбна будзе новых 2.000 навуковых працаўнікоў.

Што датычыць прадукцыі навуковых працаўнікоў, то з 1101 чал., маюць кнігі 13 проц., журнальныя артыкулы 39 проц., ня маюць нічога 48 проц.

Гэтыя лічбы гавораць аб невыстарчальным якасным складзе нашых навуковых працаўнікоў. Кваліфікаваных навуковых кадраў мала пішуць, асабліва ў апошнія гады. Чаму гэта

*ПАРТЫЙНАЕ БУДАЎНІЦТВА*

# ЗА УЗОРНУЮ ПАСТАНОУКУ ПАРТВУЧОБЫ ў транспартных арганізацыях КП(б)Б

**ЛІКВІДАВАЦЬ АДСТАВАНЬНЕ У РАБОЦЕ ШКОЛ МЕНСКАГА І АРШАНСКАГА ЧЫГУНАЧНЫХ ВУЗЛОЎ, ЦЕСНА УВЯЗАЦЬ РАБОТУ СЕТКІ ПАРТАСЬВЕТЫ СА ЗМАГАНЬНЕМ ЗА ПОУНАЕ ВЫКАНАНЬНЕ ПЛЯНУ АСЕНЬНЯ-ЗІМОВЫХ ПЕРАВОЗАК**

## *Партвучобу злучыць з ударнай работай на вытворчасьці*

Выкананьне тых адказнейшых задач, якія зараз, асабліва ў сувязі з асеньня-зімовымі перавозкамі, стаяць перад чыгуначнымі партарганізацыямі, у значнай ступені залежыць ад таго, наколькі ў гэтых арганізацыях будзе разгорнута партыйная вучоба—магутны сродак выхаваньня ідэйна-устойлівых камуністаў, здольных весьці за сабой рабочыя масы.

Пачатак навучальнага году ў партыйнай сетцы партпалетыкаў і ячэек чыгункі адзначыўся значнай цягай партыйных і рабочых мас да павышэньня свайго палітычнага ўзроўню. У некаторых партпалетыках (Аршанскі чыгуначны вузел) у выніку шырока-разгорнутай падрыхтоўчай работы да навучальнага году, у першы дзень вучобы мела месца масавая падача заяў з боку рабочых-чыгуначнікаў аб прыёме ў партыю.

Аднак, матар'ялы, якія сёньня друкуюцца, а таксама рад фактаў з месц сьведчаць аб тым, што ў значнай частцы чыгуначных партарганізацый бюро палетыкаў і ячэек на падхапілі гэтай ініцыятывы мас. Замест таго, каб замацоўваючы дасягнутыя посьпехі, яшчэ шырэй разгарнуць работу па арганізацыі партыйнай вучобы сярод чыгуначнікаў-камуністаў і беспартыйных рабочых мас, некоторыя бюро палетыкаў і пэлак абмежаваліся правядзеньнем кампаніі па перарыхтоўцы да новага навучальнага году, а непасрэдную работу партыйных школ і гурткоў прадставілі самацёку.

У выніку—у радзе чыгуначных вузлоў партаучобы разгортваецца недапушчальна марудныя тэмпамі.

Ня гледзячы на выразныя дырэктывы партыі аб ЦЕСНАЙ УВЯЗЦЫ ПАРТЫЙНАЙ ВУЧОБЫ З ЗАДАЧАМІ ВЫТВОРЧАСЬЦІ, заняткі партшкол усё яшчэ ня выйшлі з вузкіх рамак акадэмізму і такім чынам зусім мала дапамагаюць комуністам «паглыбляцца ў дэталі даручанай справы, аўладаць тэхнікай», навучыцца «кіраваць масамі ў новых умовах». Такое становішча мае месца амаль ва ўсіх партшколах Менскага чыгуначнага вузла, дзе паасобныя кіраўнікі партыйнай арганізацыі «вырашаюць» пытаньне ўвязкі тэорыі з практыкай, шляхам увядзеньня ў праграму школ спэцыяльных гадзін на вывучэньне тэхнікі. Ёсьць выпадкі, калі тэхнічная вучоба супроць стаіцца задачам аўладаньня марксыцка-ленінскай тэорыяй.

Умовы транспарту патрабуюць ад школ партыйнай сеткі асаблівай гібкасьці і пляновасьці ў рабоце. Аднак, гэтага на справе якраз і няма. Адсутнасьць належнага ўліку і пляновасьці ў рабоце партыйных школ па Менскім і асабліва Аршанскім чыгуначным вузлах прыводзяць да значнай цякучасьці слухачоў, вельмі нізкага проценту наведваньня школ.

Сыстаматычныя ЗРЫВЫ заняткаў у школах партыйнай сеткі па Аршанскім чыгуначным вузле сьвядчаць аб тым, што ў некаторых выпадках бюро партпалетыкаў і ячэек не дапамагаюць і ня кіруюць работай партшкол.

У радзе чыгуначных партпалетыкаў (Менск і інш.) усё яшчэ непаставілі работу партыйных школ на райкі сацыялістычнага спаборніцтва і ўдарніцтва.

Пляны асеньня-зімовых перавозак патрабуюць максымальнай напружанасьці ў рабоце і гібкасьці ў кіраўніцтве з боку партыйных арганізацый чыгункі ўсёй вытворчасьці транспарту. Укараненьне зьдзельшчыны, спаранай язды, гаспадарчага разрахунку і г. д.—рашаючыя ўмовы ў выкананьні адказнейшых задач, якія стаяць перад транспартам.

Аксыцыяльнае гэтых умоў немысьлімо без канкрэтнага і апэрацыйнага партыкіраўніцтва, без арганізацыі рабочых мас на барацьбу за трансфінплян. А для таго, каб арганізаваць, «КАБ ПА ВЕСЬЦІ ЗА САБОЮ МАСЫ... КАМУНІСТАМ ПАТРЭБНА ЎЗЬНЯЦЦА НА БОЛЬШ ВЫСОКУЮ ТЭАРЫТЫЧНУЮ СТУПЕНЬ».

Чыгуначныя партарганізацыі павінны рашуча асудзіць і прыцягнуць да адказнасьці тых, хто зрывае справу партыйнай асьветы і разам з гэтым неадкладна прыняць усе захады для таго, каб у самы кароткі тэрмін прарывы ў партыйнай вучобе на чыгунцы былі ліквідаваны.

## *Школы работы не пачалі*

У некаторых ячэйках Полацкага чыгуначнага вузла дырэктывы партыі аб разгортваньні марксыцка-ленінскага выхаваньня яўна недаацэньваюцца. Работа першапачатковых партыйных школ орываецца. Да гэтага часу не працуе амаль ні адна школа. Выгучаньня культпропам РК КП(б)Б кіраўнікі школ адмаўляюцца ад выкананьня даручаных ім абавязкаў. Ні парт'ячэйкі, ні райком ня прымаюць ніякіх захадаў, каб прыцягнуць гэтых таварышоў да адказнасьці.

Сакратар аб'яднанай ячэйкі тав. Алтароў ня лічыць сваім абавязкам дапамагаць і кіраваць партвучобай. Калі яго просяць дапамагчы ў рабоце партыйнай школы ён адказвае:

— Пажыньце вы мне марочыць галаву гэтай партасьветай. У мяне і так работы хапае.

У партыйнай ячэйцы дэло пытаньня аб разгортваньні марксыцка-ленінскага выхаваньня вусім не разглядалася. Ня лепш стаіць справа і ў парт'ячэйцы рамонтнай майстэрні, дзе абмежаваліся праведзеньнем запісу ў партыйныя школы і паставілі на гэтым крошку.

Усе гэтыя факты сьведчаць аб тым, што на Полацкім чыгуначным вузле разгортваньне партвучобы знаходзіцца пад пагрозай. Райком партыі павінен рашуча рэагаваць на бязьдзейнасьць кіраўнікоў чыгуначнай партарганізацыі, якія ігнаруюць выкананьне важнейшых дырэктыў партыі.

**А. Ш-ы.**

## Фралоў і Злотнікаў зрываюць вучобу

На Аршанскім чыгуначным вузле партвучоба распачата 26 верасьня. Аднак, з прычыны адсутнасьці належнага кіраўніцтва і дапамогі з боку бюро калектываў, школам партыйнай сеткі, заняткі ў гэтых школах праходзяць нерэгулярна, а ў радзе выпадкаў зрываюцца.

Асноўнай перашкодай у рабоце партшкол зьяўляецца тое, што дні, вызначаныя для партвучобы выкарыстоўваюцца для іншых мэт. Так, 6-га кастрычніка ў тым памяшканьні, дзе павінна займацца партшкола, сакратар партколектыву будаўнікоў тав. Фралоў склікаў бюро калектыву, у выніку чаго заняткі ў школе сарваліся. Такі-ж учынак меў месца з боку сакратара парт'ячэйкі будаўнікоў тав. Злотнікава.

Ня лепш пастаўлена справа з разгортваньнем партвучобы і па калектыву цягі. 29 верасьня ў памяшканьні партшколы з санкцыі бюро калектыву была склікана вытворчая нарада.

Усё гэта прывяло да таго, што значная частка слухачоў перастала наведваць партыйныя школы. З 400 асоб, якія запісаліся ў школы партсеткі па калектыву цягі, наведваюць заняткі толькі 150. У гэтым калектыве партвучобай ахоплена толькі 25 проц. членаў і кандыдатаў партыі.

У некаторых ячэйках (даглядчыкаў дзяржаўных будынкаў, ТПО і інш.) вылучаныя прапагандысты т. т. Іваноўскі і Мацаў нядбайна адносяцца да выкананьня даручанага ім абавязку, не зьяўляюцца на заняткі і гэтым самым зрываюць работу школ. Бюро парт'ячэек ведаюць аб гэтым, але не прымаюць ніякіх захадаў, каб прыцягнуць да адказнасьці зрыўшчыкаў партвучобы.

У ячэйках адсутнічае ўлік ахопу партасьветай камуністаў. У ячэйцы рамонту меў месца выпадак, калі бюро ячэйкі залічыла на завочнае навучаньне члена партыі, якога... зусім няма ў арганізацыі.

Аршанскі райком партыі павінен неадкладна зацікавіцца станам партвучобы на чыгуначным вузле, прыцягнуць да адказнасьці тых, хто зрывае оправу марксыцка - ленінскага выхаваньня і прыняць усе захады для таго, каб партыйная вучоба была пастаўлена на належную выпышню.

**Чыгуначнік.**

## Няма баявых тэмпаў у рабоце партшкол

Марксыцка - ленінскае выхаваньне па Менскім чыгуначным вузле не пастаўлена на належную вышыню. Праўда, падрыхтоўка да новага навучальнага году па партсетцы ў некаторых партколектывах вузла (служба цягі) пачалася яшчэ з 25 жніўня, аднак, належных вынікаў у разгортваньні партыйнай вучобы да гэтага часу няма.

Ні ў адным парткалектыве вузла яшчэ няма вынікаў укамплектаваньня партсеткі, прапагандысты вельмі мала знаёмы з падрыхтоўкай і запатрабаваньнямі слухачоў. У ячэйцы шляху толькі цяпер пачынаецца ўкамплектаваньне партшкол.

Фармальна амаль усе камуністы ахоплены вучобай, а на справе гэтага няма. Процант наведваньня рэдка перавышае 50, а па паравозных брыгадах наведвае толькі 25-30 проц. тых, хто запісаўся на вучобу.

Асабліва дрэнна стаіць справа ў парткалектывах чыгуначнага вузла, за выключэньнем службы эксплёатацыі, з вярбоўкай у партыйныя школы беспартыйных рабочых. Так, у школах службы цягі беспартыйныя рабочыя складаюць толькі 10 проц., а на заводзе «Полыма рэвалюцыі» і таго менш.

Прамова тав. Постышава аб чарговых задачах марксыцка - ленінскага выхаваньня не знайшла яшчэ ў парткалектывах Менскага чыгуначнага вузла належнага практычнага праламленьня. Амаль ва ўсіх школах вузла вучоба не ўвязваецца з вытворчымі задачамі транспарту.

Характэрна што на пытаньне, як увязваецца партвучоба з чарговымі задачамі чыгуначнай вытворчасьці, што зроблена ў напрамку ператварэньня партшкол у застрэльшчыкаў ажыцьцяўленьня ўказаньняў тав. Сталіна, — сакратар парткалектыву заводу «Полыма рэвалюцыі» зьдзіўлена адказвае:

— Асаблівага нічога ня зроблена. Ды і што мы можам зрабіць, калі ў нас ёсьць праграма для школ, якая зацьверджана вышэйшымі парторганамі. Адступаць ад гэтай праграмы мы ня можам.

Прапагандысты Менскага чыгуначнага вузла лічаць, што ўвязка партыйнай асьветы з вытворчасьцю абмяжоўваецца тым, што ў партшколах вылучана на некалькі гадзін на вывучэньне тэхнікі.

Вельмі мала ўвагі з боку партыйных калектываў аддаецца справе выхаваньня і ўцягненьня ў работу кандыдатаў партыі. Штодзённага вывучэньня новаўступаючых у партыю, праверкі выкананьня даручаных ім нагрузак і паводзін на вытворчасьці і г. д. не праводзіцца. Ня лепш стаіць справа з разгортваньнем марксыцка - ленінскага выхаваньня ў камсамольскіх ячэйках чыгуначнага вузла.

Істотным недахопам у рабоце партсеткі Менскага чыгуначнага вузла зьяўляецца тое, што большасьць прапагандыстаў—кіраўнікоў школ зусім не знаёмы з вытворчасьцю транспарту, не ўладаюць хаця-б некаторымі элемэнтамі не тэхнікі. Гэта значна ўскладніе работу па ўвязцы тэорыі з задачамі вытворчасьці. Між тым, з боку парткалектываў не прымаецца ніякіх захадаў, каб падрыхтаваць кіраўнікоў школ з ліку рабочых, камуністаў - транспартнікаў.

Слаба разгорнута работа па павышэньні палітычнага ўзроўню сярод партактыву.

Усё гэта ставіць перад партыйнай арганізацыяй Менскага чыгуначнага вузла неадкладную задачу — рашуча павярнуцца тварам да марксыцка - ленінскага выхаваньня, узьняць разгортваньне гэтай адказнейшай работы на належную палітычную вышыню.

Ліквідаваць наяўныя прарывы ў партвучобе яшчэ ня позна. Трэба толькі зараз-жа ўзяцца—у першую чаргу прапагандыстам—за глыбокую распрацоўку прамовы тав. Постышава, пастановы аб партвучобе ЦК КП(б)Б і культпрапаралы за неадкладнае правядзеньне іх у жыцьцё.

**К—р.**

## Поўная бязьдзейнасьць

**ДУБРОЎНА.** Загатоўкі жывёлы ў вёсцы Чубокава (Цілевіцкага сельсавету) праходзяць недапушчальна марудна. Да гэтага часу яшчэ не даведзены цьвёрдыя заданьні да кулацка-заможных гаспадарак. Камісія садзейнасьці загатоўкам літаральна бязьдзейнічае. Старшыня камісіі Касьцючэнка вусім адмаўляецца ад працы.

Бязьдзейнасьцю сельсавету і камсоду карыстаюцца кулацка-заможныя элементы, якія разбазараюць сваю жывёлу і ядуць шалёную антацыю супроць жывёлазагатовак.

**Чарняўскі.**

*ТОРФ—ФАБРЫКАМ І ЗАВОДАМ*

# ЯШЧЭ НЯ СКОНЧАНЫ СПРЭЧКІ

## Бюракраты ігнаруюць загад ВСНГБ № 260, які ўскладае адказнасьць за вывазку на спажыўцоў

**Пры актыўнай дапамозе торфзаводаў, торф павінен быць вывезен поўнасьцю**

## Мэханізаваць вывазку торфу!

На балотах торфазаводаў застанецца ляжаць пад сьнегам 9.860,7 тон апалу. Звыш 3 ПРОЦ. усёй здабытай торфу ня складзена ў кагаты. 7,6 проц. здабытай складзена ў малыя клеткі і 12,5 у вялікія. Праграма па складаньні торфу ў кагаты па ўсёй торфапрамысловасьці выканана ўсяго на 72,6 ПРОЦ.

У першых радох па складаньні торфу ў кагаты ідзе завод «ШЛЯХ ДА САЦЫЯЛІЗМУ» — 90 ПРОЦ. усёй здабытых. За ім «Асінторф» — 64,4 проц. Ганебна цягнуцца ў хвосьце завод «Міханавічы» і «1 мая». На першым не паднята яшчэ 14,8 ПРОЦ. усёй здабытых і 7,2 ПРОЦ. НА ДРУГІМ.

Арганізацыі апошніх торфазаводаў ня ўсё зрабілі для таго, каб своячасова прывесьці ў парадак здабыты апал. Зараз сушыць торф не дае магчымасьці надвор'е. Не падняты торф павінен чакаць наступнай вясны. Але той торф, які складзен у невялічкія кучкі, неабходна скласьці ў кагаты. Для гэтага трэба скарыстаць добрыя дні восені. Мясцовыя партыйныя і прафсаюзныя арганізацыі павінны дапамагчы торфазаводам у справе забесьпячэньня рабочай сілай. Сухі торф павінен быць прыведзен у належны парадак.

НА ЛЕПШ СТАІЦЬ СПРАВА І З ВЫВАЗКАЙ ТОРФУ. Яшчэ ў ліпені НК-РСІ вынес пастанову аб перадачы справы вывазкі непасрэдна спажыўцам. На падставе гэтай пастановы, ВСНГБ даў загад усім прадпрыемствам, якія ўжываюць торф, каб яны вывозілі торф самі. Але дагэтуль ні пастанова НК РСІ, ні загад ВСНГ спажыўцамі НЯ ВЫКОНВАЕЦЦА.

Калі ў мінулым годзе Белторф меў 25 ТРАКТАРАЎ для вывазкі торфу і ўсё-такі засталося нявывезеным 65 тысяч тон, дык у гэтым годзе вывазка гужом амаль не пачыналася, а аб вывазцы машынамі ніхто ня думае.

На Барысаўскай запаснай фабрыцы «ЧЫРВОНАЯ БЯРЭЗІНА» значна павялічыліся прастоі з прычыны адсутнасьці параэнэргіі. Электрастанцыя не забясьпечана апалам. Патрэбна штодзённа 1.500 ФУРМАНАК для таго, каб справіцца даць торфу станцыі, а фактычна возіць толькі 10 ФУРМАНАК. Гарсавет і гарпрафсавет нічога ня робяць у справе забесьпячэньня фурманкамі электрастанцыі.

Спажыўцы торфу таксама спадзяюцца на самацёк. Замест таго, каб паставіць пытаньне перад адпаведнымі органамі аб злучэньні вузкакалейкай станцыі з торфазаводам «ЧЫРВОНЫ КАСТРЫЧНІК», спажыўцы абіваюць парогі вышэйшых устаноў, патрабуючы зьняць з іх адказнасьць за вывазку торфу.

Прыкладаў, падобных Барысаву, ёсьць ня мала. Але справай вывазкі, мэханізацыяй яе пакуль ніхто не займаецца. Для таго, каб фабрыкі і заводы, якія спажываюць торф, працавалі бесьперабойна, неабходна ў чацьвертым квартале вывезьці 46.915 ТОН ТОРФУ. Для гэтага трэба мабілізаваць рабочых, кампасьнікаў і адказасобнікаў з тым, каб папярэдзіць прарыў. Плян вывазкі торфу павінен быць выканан.

Ударнік за работай

## Пагрузачная зрывае тэмпы фабрыкі „Герой працы"

Для таго, каб Добруская папяровая фабрыка «Герой працы» працавала бесьперабойна, неабходна, каб па тросу падвесной дарогі штодзённа накіроўвалася ня менш 350 ваганэтак з торфам. За апошні час пагрузачная станцыя сыстэматычна ня выконвае заданьня. Павялічыліся прастоі на фабрыцы з прычыны адсутнасьці параэнэргіі. За 10 дзён кастрычніка фабрыка прастаяла больш чым 150 рабочых гадзін.

Дырэктар пагрузачнай станцыі тав. Шапшын ня здолеў стварыць умоў для працы грузчыкаў. Да гэтага часу няма ні аднаго апеленага бараку. Пастанова бюро парткому аб своячасовым скапчаньні будаўніцтва ня выканана. Адсюль і цякучасьць рабочай сілы, якая даходзіць за 50 проц. кожны месяц.

ЗРК ня цікавіцца паляпшэньнем грамаджага харчаваньня. Былі выпадкі калі рабочыя пагрузачнай станцыі па два дні не атрымлівалі хлеба.

Бязьдзейнасьць кіраўніцтва пагрузачнай характарызуецца і тым, што да гэтага часу ня выканалі студні і рабочым прыходзіцца хадзіць за вадой за два кілёмэтры ад бараку.

Партыйныя і прафсаюзныя арганізацыі Добруша не павінны дапусьціць прастою фабрыкі. Аварыйныя з пагрузачнай станцыі, якія спаей бязьдзейнасьцю зрываюць выкананьне праграмы, павінны быць выкрыты і прыцягнуты да адказнасьці.

Брыгада «Зьвязды»
**КЛІМЕНАК, НЕЙДЛІН.**

## Забясьпечыць „Эльвод" апалам

Для забесьпячэньня апалам Менскага «Эльводу» прымацаваны 3 торфазаводы —«Чырвоны сьцяг», «Смалявічы», «Міханавічы». Вывазка торфу заводамі да чыгункі праходзіць надзвычай дрэнна. Гэта ў той час, калі «Эльвод» забясьпечан толькі 2-х тыднёвым запасам торфу. Аб становішчы з апалам на «Эльводзе» Белторфаб'яднаньне папярэджана своячасова, але замест таго, каб прымусіць кіраўнікоў торфазаводаў скарыстаць усе магчымасьці для фарсаваньня вывазкі торфу, асобныя работнікі аб'яднаньня разважаюць:

— Хто вам паверыць, што ў вас 2-х тыднёвы запас?

Для таго, каб забясьпечыць «Эльвод» 2-хмесячным запасам торфу неабходна зараз, пакуль балоты не заліты вадой, вывезьці да чыгункі 720 тон торфу. З заводу «Чырвоны сьцяг» ужо нельга вывазіць торф. Патрэбную колькасьць «Эльводу» апалу павінны даць «Смалявічы» і «Міханавічы».

У «Міханавічах» па часовай вузкакалейцы можна вывозіць у дзень каля 140 тон, а вывозіцца толькі 70 тон. Ёсьць магчымасьць пусьціць 12 ваганэтак у 7 зваротаў штодзённа, а пускаецца толькі 7.

На заводзе валяецца 5 ваганэтак, да якіх патрэбна-б было толькі прыдзелаць кузавы і можна было-б вывазіць на іх торф, але гэтага ня зроблена і ваганэткі не скарыстоўваюцца.

Бязьдзейнасьць дырэктара заводу Гуцава можа прывесьці да таго, што торф астанецца на балоце да таго часу, пакуль наступіць санная дарога.

Апартуністычная практыка ў рабоце торфазаводу «Міханавічы» затрымала пракладку пастаяннай вузка-калейкі. Па насыпе заданьне выканана толькі на 50 проц. Неабходна пабудаваць мост, а лесаматар'ялы яшчэ не падведзены да месца прызначэньня. Не хапае таксама рабочай сілы для апрацоўкі лесаматар'ялаў і вывазкі грунту на насып.

Па ўноў пабудаванай вузка-калейцы павінна быць вывезена да чыгункі 3.800 тон торфу. Ад своячасовай пракладкі вузка-калейкі залежыць бесьперабойнае забесьпячэньне «Эльводу» апалам. Неабходна прымусіць кіраўніка торфазаводу Гуцава своячасова скончыць пракладку.

Мясцовыя партыйныя і савецкія арганізацыі павінны дапамагчы торфазаводаў у наборы цесьляроў і гарбароў.

3,5 тысяч тон торфу павінен даць «Эльводу» торфазавод «Смалявічы». Але становішча з вывазкай торфу смалявіцкіх распрацовак такое-ж як і ў «Міханавічах». Транспартны аддзел Белторфу павінен скарыстаць усе магчымасьці для дастаўкі 5 тон жалеза для абцяжкі драўляных вузка-калейных рэек.

За бесьперабойную працу «Эльводу» павінны несьці адказнасьць і кіраўнікі Белторфу і торфазаводаў.

**К.**

## *Дапамагчы торфазаводу*

ЧАШНІКІ. (Наш кар.). Папяровая фабрыка «Чырвоная зорка» карыстаецца торфамі, які здабываецца торфазаводам «1-га мая». Але фабрычныя арганізацыі не цікавяцца сушкай торфу: таксама і вывозкай яго на фабрыку. Аб дапамозе торфазаводу з боку фабрычнай грамаджаскі «Чырвонай Зоркі» толькі гавораць, практычна-ж нічога ня робіцца. Зіма з кожным днём набліжаецца, а на балоце торфазаводу дагэтуль не зьнята 7,2 проц. здабытых.

Неабходна наладзіць практычную дапамогу торфазаводу з боку фабрычных арганізацый папяровай фабрыкі. Трэба прымусіць кіраўнікоў торфазаводу падабраць і высушыць здабыты апал.

**Ударнік.**

## *Сушка торфу— забыты вучастак*

МІХАНОВІЧЫ. (Наш кар.). Сушцы торфу на заводзе «Міхановічы» аддаецца вельмі мала ўвагі. Многа торфу ляжыць у маленькіх кучках і не складаецца ў кагаты. Звыш 14 проц. усёй здабытых торфу ляжыць на балоце не зьнятым.

Апартуністычная бязьдзейнасьць кіраўнікоў заводу стварае пагрозу выкананьня плану вывазкі торфу.

**А.**

Буздаўніцтва Яраслаўскага аўтагіганту

„Палепшыць бытавыя ўмовы рабочых—такава задача" (Сталін)

# ГОМЕЛЮ— МАГУТНУЮ КАМУНАЛЬНУЮ ГАСПАДАРКУ

## ПАСТАНОВА ПЛЕНУМУ ГОМЕЛЬСКАГА ГАРКОМУ—БАЯВАЯ ПРАГРАМА САЦЫЯЛІСТЫЧНАЙ РЭКАНСТРУКЦЫІ ГАРАДЗКОЙ ГАСПАДАРКІ

На базе вялізарных дасягненьняў у Індустрыялізацыі краіны і сацыялістычнай перабудове сельскай гаспадаркі, партыя і рабочая кляса дабіліся вялікіх посьпехаў у аднаўленьні і паляпшэньні камунальнай гаспадаркі адкага з буйнейшых прапетарскіх цэнтраў БССР — ГОМЕЛЯ.

Лічбы яскрава сьведчаць аб гэтым. Да рэвалюцыі ў Гомелі была адна станцыя, якая давала 100 кілёват электраэнэргіі. Зараз станцыя дае 5.000 кілёват — рост у 50 раз. Раней асьвятлялася толькі цэнтральная частка гораду, зараз 80 проц. насельніцтва карыстаюцца электра-асьвятленьнем.

Да рэвалюцыі водаправод быў праведзен толькі ў 450 дамох, водаправодная сетка мела 22,5 клм. агульнай даўжыні. Зараз у водаправодную сетку ўключаны 600 дамоў, даўжыня сеткі дасягае 42 клм.

Лік навучальных устаноў за 14 год павялічыўся ў 9 раз: з 6 да 54. Напісьменных было больш 50 проц., зараз — 1,5 проц. Пабудаваны вута-транспарт, лесьні, пральня. Пабудавана 317 НОВЫХ ДАМОЎ, З АКРАІН У ЦЭНТРЫ ПЕРАСЕЛЕНА 20.000 РАБОЧЫХ.

Аднак, тэмпы разьвіцьця камунальнай гаспадаркі адстаюць ад тэмпаў росту прамысловасьці г. Гомелю і запатрабаваньняў працоўнага насельніцтва.

Пленум Гомельскага гаркому КП(б)Б, які адбыўся ў канцы верасьня, вызначыў рад важнейшых мерапрыемстваў па разьвіцьці гарадзкой гаспадаркі.

Пленум прызнаў неабходным: на працягу 1932 году новыя дамы і пепшыя кватэры ў цэнтры гораду засяліць ня менш, як на 85 проц. рабочымі гомельскіх прадпрыемстваў, 225.000 руб., асигнаваныя на рамонт жаўтэсных дамоў у г., павінны быць поўнасьцю скарыстаны. У 1932 годзе рамонт трэба правесьці на суму 500.000 руб.

Пленум абавязаў жыльлёва-будаўнічыя арганізацыі скончыць будаўніцтва дамоў вызначаных плянам г. г. Жылсаюз павінен загатовіць неабходную колькасьць матар'ялаў для будаўніцтва 8 дамоў легкага тыпу. Пленум адзначыў слабы ўдзел прамысловасьці ў жыльлёвым будаўніцтве; гаспадарчыя арганізацыі надаваць значэньне жыльлёвага будаўніцтва ў справе ліквідацыі цякучасьці рабочай сілы. Пленум абавязаў ГОМСЕЛЬМАШ скончыць у гэтым годзе пабудову дому, пачатага ў мінулым, „уступіць да закладкі новага дому; у 1932 годзе пабудаваць 300 кватэр лёгкага тыпу. Усяго ў 1932 годзе павінна быць пабудавана 360 кватэр.

ДРЭВААПРАЦОЎЧАМУ КАМБІНАТУ прапанавана поўнасьцю скарыстаць сродкі ў разьмеры 150.000 руб., адпушчаныя на жыльлёвае будаўніцтва. У 1932 годзе павінна быць пабудавана ня менш 200 кватэр лёгкага тыпу. МАРГАРЫНАВЫ ЗАВОД павінен пабудаваць 50 кватэр лёгкага тыпу, чыгунка — 200 кватэр, водны транспарт — 300 і г. д.

Па лініі жылсаюзу і гарадзкога бюджэту ў 1932 годзе павінна быць пабудавана ня менш 3.000 кватэр. Дамы, як правіла, павінны будавацца ў 3-4 паверхі, з вызначэньнем плошчы для бытавых устаноў (пляцоўкі, душы, пральня і г. д.).

Прэзыдыуму гарсавету даручана фарсаваць будаўніцтва керамічнага заводу № 5 з мэханізаванай сушылкай.

Пленум прызнаў неабходным прыступіць у 1932 годзе да ПАБУДОВЫ КАНАЛІЗАЦЫІ Ў ГОРАДЗЕ. Не пазьней 1-га студзеня 1932 году павінна быць скончана пабудова пральні, а таксама пазьні. У кантрольных лічбах 1932 году вызначана будаўніцтва новай пральні ў Нова-Беліцы і Добрушы. Камунаддзел да 1-га студзеня 1932 году павінен давесьці свой асэнізацыйны абоз да 120 бочак, з іх 25 пнэўматычных.

Прымаючы пад увагу існаваньне ў Гомелі значнай колькасьці вышэйшых навучальных устаноў, пленум прызнаў неабходным пачаць будаўніцтва ІНСТЫТУЦКАГА ГАРАДКА, у якім будуць сканцэнтраваны ўсе ВНУ. У 1932 годзе трэба прыступіць да пабудовы ПАЛАЦУ КУЛЬТУРЫ Ў ГОМЕЛІ.

Праграма камунальнага будаўніцтва будучага году прадугледжвае таксама перабудову радыё-станцыі са значным павялічэньнем яе магутнасьці, пабудову адкрытых сталоўні і фабрыкі-кухні, двух школ, дзіцячай тэхнічнай станцыі, дому адпачынку на 300 чал. і дзённага дому ўдарнікаў на 60 чал.

Зараз, як адзначалася вышэй, да 80 проц. насельніцтва карыстаюцца электрычным асьвятленьнем, аднак, рад вуліц, асабліва ў рабочых раёнах дагэтуль яшчэ не асьветлены. Пленум прапанаваў камунальнаму аддзелу правесьці ў чацьвертым квартале г. г. звышплянавыя капітальныя работы па электрыфікацыі гораду на 40.000 руб. Работы дадуць магчымасьць ахапіць электраэнэргіяй яшчэ 700-750 дамоў, пераважна, ў рабочых раёнах.

## 2.000 кватэр пабудаваць у 1932 г.

Гадавы плян жыльлёвага будаўніцтва па БССР (па лініі Белжылсаюзу) выкананы на 40 проц. У гэтым годзе Белжылсаюз міркуе скончыць 112-кватэрны дом на Маскоўскай вуліцы і пабудову 15 стандартных дамоў.

Поўнасьцю плян будаўніцтва ня выкананы, паводле думкі старшыні БЖС, з-за недахвату патрэбных будматар'ялаў. Белжылсаюз на прыняў энэргічных мер, каб наладзіць выраб мясцовых будаўнічых матар'ялаў, каб адрамантаваць у гэтым годзе ўвесь жыльлёвы фонд.

На 1932 год Белжылсаюз вызначыў выдатковаць на жыльлёвае будаўніцтва 38 мільёнаў руб., з іх 23 млн. руб. на пабудову дамоў стандартнага і палегчанага тыпу. У адных стандартных дамох будзе да 10.000 кватэр. На пабудову новых заводаў на вырабе стандартных дамоў і будаўнічых матар'ялаў вызначана 4.042 тыс. руб.

Пастанова абавязвае Менгарком КП(б)Б, менгарсавет і ўсе ведамствы закончыць на працягу 1931 г. вызначаную на гэты год праграму жыльлёвага будаўніцтва. СНК і ЦК прызналі матэгадным практыкаваць падбудаваньне новых паверхаў на існуючых дамох. На 1932 год вызначана пабудаваць у Менску 2.000 кватэр, з іх 1.000 кватэр лёгкага стандартнага тыпу. Белжылсаюз павінен да 1 сьнежня 1931 году пабудаваць завод для выробу стандартных драўляных дамоў. Завод павінен быць поўнасьцю забясьпечан абсталяваньнем і будаўнічымі матар'яламі. Менскаму гораджоку савету даручана поўнасьцю ад рамантаваць старыя дамы з тым, каб на працягу двух год адпавіць увесь жыльлёвы фонд. Менгарком КП(б)Б і менгарсавет павінны прыняць усе меры да пашырэньня існуючых прадпрыемстваў па вырабе мясцовых будаўнічых матар'ялаў і да павялічэньня іх вытворчых праграм.

Пастанова СНК і ЦК зьяўляецца катэгарычнай і выразнай дырэктывай для ўсёй сыстамы жыльлёвай кампаніі. Пры дапамозе ўсёй арганізацыі жыльлёвай кампаніі Менску павінна поўнасьцю і ў тэрмін ажыцьцявіць вызначаныя пастановай ЦК і СНК мерапрыемствы па паляпшэньні жыльлёвага становішча працоўных гораду.

## Укараненьне зоавэтмінімуму— асноўнае зьвяно ў барацьбе за сацыялістычную жывёлагадоўлю

**Узьнімем саўгасныя і калгасныя масы на санітарнае аздараўленьне жывёлагадоўчых гаспадарак**

## СЬВІНАРНІКІ—НЕ ПРАХАДНЫЯ ДВАРЫ

СЛУЦАК. (Ад нашага спэцкора). У Слуцкім — асноўным жывёлагадоўчым раёне БССР — барацьба за ўкараненьне зоавэтмінімуму ў работу жывёлагадоўчых калгасаў, за ажыцьцяўленьне асноўных зоатэхнічна-прафілактычных мерапрыемстваў мае асаблівае значэньне.

Толькі прыцягненьнем да гэтай справы шырокіх мас калгасьнікаў і калектываў саўгасаў мы зможам у найкарацейшы тэрмін ліквідаваць эпізоатыі, якія яшчэ наносяць вялізныя страты сацыялістычнай жывёлагадоўлі.

Наркамземам БССР амаль месяц таму назад быў выдан спэцыяльны загад па подпісам тав. Рачыцкага, які вызначае канкрэтныя мерапрыемствы ў галіне барацьбы з эпізоатыямі, асабліва з чумою.

Трактавыя дарогі, якія праходзяць праз жывёлагадоўчыя саўгасы і калгасы, зьяўляюцца адным са сродкаў распаўсюджаньня розных захворваньняў жывёлы. Тав. Рачыцкі ў сваім загадзе дае катэгарычныя паказаньні аб закрыцьці ўсіх дарог, якія праходзяць праз жывёлагадоўчыя саўгасы і калгасы.

Як-жа ў Слуцкім праваэзіцца ў жыцьцё адказьнейшая пастанова Наркамазем?

Райсамаддзел, на які ўскладзена адказнасьць за правядзеньне санітарна-прафілактычных мерапрыемстваў, дагэтуль фактычна нічога не зрабіў.

Слуцкая бойня трымаецца ў вельмі антысанітарным становішчы і зьяўляецца крыніцай распаўсюджаньня захворваньняў. Калгасьнікі і рабочыя саўгасаў, якія наведваюць бойню, разносяць заразу па саўгасах і калгасах. Скотамагільнікі ў большасьці сельсаветаў ня прыведзены ў належны выгляд і, як правіла, знаходзяцца зусім бліска ад праезных дарог.

Дарогі праз буйнейшыя саўгасы і калгасы не закрыты. Так, напрыклад, у буйнейшым саўгасе Бранчыцы, які мае звыш тысячы штук сьвіней, праезная дарога праходзіць праз увесь сьвінны гарадок. Другая дарога праходзіць побач са сьвінарнікамі. Такое-ж становішча і ў іншых жывёлагадоўчых гаспадарках. Праз сьвінарнікі ходзяць усякі, каму толькі захочацца.

Атрад ВЭТ у Слуцкім раёне вельмі пасьпяхова праводзіць актыўную супроцьчумную прышчэпку сьвіньням, г. зн., што сьвіньням пускаецца ў кроў шкодная доза чумнага вірусу. Сьвіньня пасьля прышчэпкі перахворвае гэтай хваробай у лёгкай форме і арганізм не становіцца няспрыймальным да чумы. Пасьля актыўных прышчэпак у Слуцкім раёне адыход сьвіней у сярэднім дасягаў усяго 2-3 проц. Персанал атраду добрасумленна адносіўся да сваіх абавязкаў. Але атрад ВЭТ не атрымліваў амаль ніякай дапамогі з боку раённых арганізацый.

Райкалгасаюз на працягу месяца амаль ня ведаў, што на раёне праводзіцца актыўныя прышчэпкі. Ветэрынарны фальчар райкалгасаюзу тав. Рагалевіч скарыстоўваецца не па сваім простым прызначэньні, а як спэцыяліст па трусагадоўлі.

Калгасныя масы зусім не мабілізаваны на барацьбу з эпізоатыямі, ва дапамогу атраду ВЭТ па правядзеньні прафілактычных мерапрыемстваў.

Сам атрад ВЭТ таксама не вядзе ніякай масава-санітарнай работы сярод калгасьнікаў і рабочых саўгасаў. Калгасная і саўгасная маса ня ведае, што такое чума, як з ёю змагацца і як папярэдзіць яе распаўсюджаньне.

У буйнейшых саўгасах Ненрашы і Бранчыцы сярод персаналу, які

Год выданьня—XV
№ 236 (4192)
Аўторак, 20 кастрычніка
Цана нумара 5 кап.
выходзіць
БЕСЬПЕРАПЫННА

# ЗЬВЯЗДА

Органа ЦК Мен. Гарному Камуністычнай партыі (б) Беларусі.

РЭДАКЦЫЯ І КАНТОРА
МЕНСК, САВЕЦКАЯ, 63.
Тэлефоны:
рэдактар—6-27, сакратар—10-74, партсэктар—13-80, прамысл.—13-80, сац. замл.—6-19, мясц. інформ.—6-19, замоў. інформ.—6-19, мы рэдактар—642, міжнародны інфэктар—10-74, адк. справы, ва—7-81, аддзел абвестак—7-[illegible]

Апал—прамысловым цэнтрам

## ДА І-га СЬНЕЖНЯ ПЕРАВЕСЬЦІ

### 75 проц. лесарубаў—на брыгадныя мэтады працы

Першая дэкада кастрычніка не дала напежнага пералому ў загатоўках і адгрузцы дроў для прапетарскіх цэнтраў і прамысловасьці.

За час з 1 па 11 кастрычніка квартальны плян загатовак дроў выканан неспрамгасамі толькі на 0,3 проц. Яшчэ горш праходзіць вывазка дроў з песу на чыгуначныя станцыі. Квартальны плян вывазкі выкананы на 0,8 проц.

Рад леспрамгасаў, як Бягомльскі, Бялыніцкі, Заслаўскі, Койданаўскі, Лагойскі, Жыткавіцкі, Нараўлянскі, Клічаўскі, Старобінскі, Буда-Кашалёўскі і інш. за апошнюю дэкаду ня вывезьлі ні аднаго мэтра дроў.

Такі ход загатовак і адгрузкі дроў можа стварыць напружанае становішча ў забесьпячэньні прамысловасьці і прапетарскіх цэнтраў апалам.

Аднэй з асноўных прычын дрэннага ходу загатовак зьяўляецца недахват рабочай і гужавой сілы на песазагатоўках.

Раённыя арганізацыі і леспрамгасы ў пытаньнях вярбоўкі рабочай сілы спадзяюцца на самацёк, не перабудаваліся на новыя формы вярбоўкі.

У пачатку верасьня дырэктыўныя органы далі ясныя ўказаньні аб разгортваньні кампаніі па заключэньні дагавораў з калгасамі на рабочую сілу. Дагаворы прадугледжваюць рад льгот і прэмій для рабочых-лесарубаў. Апрамя гэтага, урад даў дадатковыя ільготы па с.-г. падатку калгаснікам і аднаасобнікам, якія працуюць на загатоўцы і адгрузцы дроў.

Усе гэтыя ільготы шырокім масам сялянства невядомы. Масавая работа вакол дагаворнай кампаніі, вакол новых форм вярбоўкі рабочых сіл не разгорнута. Большасьць РВК, замест разгортваньня масавай работы, абмяжоўваюцца сухімі пастановамі і цыркулярамі.

Зусім недапушчальную бязьдзейнасьць у вярбоўцы рабочай сілы праяўляе саюз лясных рабочых, які нічога не зрабіў для папулярызацыі ільгот лесарубам.

Рад раёнаў да гэтага часу прытрымліваецца апартуністычнай тэорыі «чарговасьці» кампаніі. Дрэнны ход загатовак і адгрузкі дроў гэтыя раёны тлумачаць тым, што людзі заняты на копцы бульбы. У той-жа час ня прымаюцца меры да вярбоўкі сталай рабочай сілы з калгасаў, якія бульбу ўжо выкапалі.

Адна з прычын слабага ходу загатовак і адгрузкі — дрэнная забесьпячэньне рабочых-лесарубаў харчамі і прамтаварамі. Апарат лесрабкопаў працуе вельмі дрэнна. Большасьць раёнаў, як Асіпавіцкі, Бабруйскі, Койданаўскі, Заслаўскі і г. д. амаль зусім не забясьпечаны прамтаварамі.

Лясная сэкцыя Белкаапсаюзу заключыла дагаворы з лесрабкопамі на дастаўку тавараў, але ліміты гэтым лесрабкопам не пераведзены. У выніку тавар лесрабкопамі ня выкупляецца.

Да гэтага часу на лясных вучастках слаба пастаўлена арганізацыя працы, не ліквідавана абязьлічка. За тэхнікамі не замацаваны пэўныя вучасткі.

Брыгадныя мэтады работы ў загатоўках і вывазцы ўжываюцца вельмі слаба.

Таксама слаба разгорнута сацсаборніцтва паміж асобнымі вучасткамі, брыгадамі і лесарубамі. Саюз лесрабочых мала ўвагі аддае пытаньням разгортваньня сацсаборніцтва і ўдарніцтва на песазагатоўках.

Пастанова ЦК КП(б)Б дала выразныя дырэктывы раённым арганізацыям аб мэтадах барацьбы за апал. Раённыя арганізацыі павінны дабіцца поўнага ажыцьцяўленьня пастановы ЦК, павінны дабіцца бесьперабойнага забесьпячэньня прапетарскіх цэнтраў апалам.

## ЗАМЕСТ 1500—500

БАБРУЙСК. ПЛЯН ЗАГАТОВАК ДРОЎ У 3-М КВАРТАЛЕ ПА БАБРУЙСКІМ ЛЕСПРАМГАСЕ ВЫКАНАН УСЯГО НА 25,4 ПРОЦ., А ПА ВЫВАЗЦЫ НА 29,6 ПРОЦ.

ПЕРШАЯ ДЭКАДА КАСТРЫЧНІКА НЕ ДАЛА ПАЛЯПШЭНЬНЯ, А НААДВАРОТ ПАКАЗВАЕ ЯШЧЭ БОЛЬШ СЛАБЫЯ ТЭМПЫ РАБОТЫ. ЗАДАНЬНЕ НА ЗАГАТОЎЦЫ ДРОЎ ВЫКАНАНА ЎСЯГО НА 30 ПРОЦ., А ПА ВЫВАЗЦЫ НА 3 ПРОЦ. ЗАМЕСТ 1500 ЛЕСАРУБАЎ, У ЛЕСЕ ПРАЦУЕ ТОЛЬКІ 500 ЧАЛ. ЯШЧЭ ГОРШ З ВЫВАЗКАЙ. ЗАМЕСТ 800 ФУРМАНАК ПРАЦУЕ ТОЛЬКІ 500.

ЛЕСПРАМГАС ДА ГЭТАГА ЧАСУ НЕ ПЕРАБУДАВАЎ СВАЁЙ РАБОТЫ, НЕ МАБІЛІЗАВАЎ УСІХ СІЛ НА ВЫКАНАНЬНЕ ПЛЯНАЎ ЛЕСАЗАГАТОВАК І ВЫВАЗКІ.

БОЛЬШАСЬЦЬ ВУЧАСТКАЎ ЯШЧЭ НЕ ПРЫСТУПІЛА ДА ЗАКЛЮЧЭНЬНЯ ДАГАВАРОЎ НА РАБОЧУЮ СІЛУ.

ІЛЬГОТЫ, ЯКІЯ ПРАДАСТАЎЛЯЮЦЦА ЎРАДАМ РАБОЧЫМ, ЗАНЯТЫМ НА ВЫВАЗЦЫ І ЗАГАТОЎЦЫ ДРОЎ, СЯРОД СЯЛЯНСТВА НЕ ПАПУЛЯРЫЗАВАНЫ.

## Вучастак „Служа" зрывае загатоўку дроў

Па вучастку «Служа» Гарадзянскага вучлеспрамгасу (Асіповіцкі раён) загатоўка і вывазка дроў зрываецца. Заданьне па загатоўцы на верасень выкананa ўсяго на 45 проц., па вывазцы—на 35 проц.

За ход вывазкі і загатоўкі дроў ніхто не адказвае. Спецвопратка на працягу 2 месяцаў ляжала на складах і ня выдавалася рабочым.

Прадуктамі рабочыя-лесарубы спаджаюцца дрэнна. У выніку наглядаецца вялікая цякучасьць рабочай сілы. Жыцьцёвая дача засталася без рабочых. Вярбоўка рабочай сілы пакінута на самацёк.

Гарадзянскаму вучлеспрамгасу трэба ўжыць тэрміновыя захады для наладжваньня работы вучастку «Служа».

Абязьлічка і самацёк у рабоце павінны быць ліквідаваны.

Рабкор.

## За 50-тысячны тыраж „Зьвязды"

### РАБОТУ ПА РАСПАЎСЮДЖАНЬНІ—НА УДАРНЫЯ ТЭМПЫ

ГОМЕЛЬ.

**Газэтнае бюро ў справе распаўсюджаньня «Зьвязды», як і раней, зусім бязьдзейнічае.** Гарком КП(б)Б ня прымае належных мер да прасоўваньня «Зьвязды» ў шырокія масы працоўных. **Гомель** адзін з буйнейшых прамысловых цэнтраў БССР, **замест таго, каб паказаць прыклад барацьбы за тыраж ЦО КП(б)Б — знаходзіцца ў глыбокім тылу.** «Зьвязда» ў Гомелі і па раёне распаўсюджана зусім мала. Так, калі ў **верасьні выпісвалася 2.145** экз., дык **на кастрычнік гэта мізэрная лічба яшчэ больш зьменшылася і складае толькі 1.934 экз.** — 30 проц. у адносінах да ліку членаў партарганізацый. Што адказна на гэта Гомельскі гарком КП(б)Б і газэтнае бюро.

З.

* * *

СЛУЦАК.

Раён увесь час зьяўляецца адным з перадавых па распаўсюджаньні «Зьвязды». З месяца ў месяц крывая падпіскі ідзе ўверх. Прывядзем некаторыя даныя, каб паказаць гэта. Так, яшчэ **ў красавіку 1930 г. падпіска да ліку членаў партарганізацый складала 128 проц.,** у красавіку г. г. — 140 проц., між тым, як у іншых раёнах гэты процант у паказаны вышэй час не перавышаў 25-30. Случыцца на гэтым усё-ж ня спынілася.

Надаючы вялікае значэньне справе яшчэ больш максымальнага прасоўваньня друку, у прыватнасьці ЦО КП(б)Б «Зьвязды», у шырокія масы працоўных раённыя арганізацыі і газбюро па-баявому ўзяліся за работу. На падставе добра наладжанай арганізацыйнай і шырокай масавай працы вакол газэты. Случыцца дабіцца вялікіх посьпехаў. **На верасень лік падпісчыкаў на «Зьвязду» складаў 1.370. На кастрычнік падпіска зьнізілася да 1.020 экз.,** але ўсё-ж да ліку членаў партарганізацый складае 262 проц. **Слуцкі райком КП(б)Б, газбюро і раённыя арганізацыі ў далейшым не павінны дапусьціць паніжэньня дасягнутага ўдарнай работай тыражу, а прыняць меры да яшчэ большага яго павялічэньня.**

Усім раёнам Беларусі, у першую чаргу райкомам КП(б)Б, газбюро і райарганізатарам трэба раўняцца па Слуцкім раёне.

Ш.

* * *

Рад раёнаў, падпарадкаваўшы работу па распаўсюджаньні «Зьвязды» самацёку, **паніжаюць падпіску.** У кастрычніку выпісваецца і панізілася ў параўнаньні з верасьнем:

| | | | |
|---|---|---|---|
| Бягомльскі | — 172 экз. | паніж. | 27 |
| Заслаўскі | — 162 » | » | 24 |
| Магілеўскі | — 1149 » | » | 82 |
| Талочынскі | 329 » | » | 34 |
| Хойніцкі | — 232 » | » | 33 |
| Кармянскі | — 153 » | » | 22 |

Наадварот частка раёнаў з верасьня па кастрычнік дала павялічэньне падпіскі. Так, напрыклад:

Бешанковіцкі — на 50 экз.
Глускі — на 35 экз.
Койданаўскі — на 88 экз.
Вушацкі — на 40 экз.
Чырв. Слабодзкі — на 53 экз.
Уваравіцкі — на 30 экз.

* * *

ПОЛАЦАК.

Аб дрэнным становішчы з работай па пашырэньні «Зьвязды» па Полацку і раёне ўжо пісалася, але справа гэта яшчэ не прасунулася ўперад. Ня гледзячы на тое, што **раён значна ўзбуйнен, наглядаецца зьніжэньне тыражу.** У чэрвені па Полацкім і Ветрынскім раёнах выпісвалася 646 экз. «Зьвязды», а пасьля аб'яднаньня ў верасьні налічвалася 547 падпісчыкаў. Больш таго, **на кастрычнік лічба падпіскі панізілася** да 493 экз., што складае 38 проц. у адносінах да ліку членаў партыйнай арганізацыі.

Ф—о.

* * *

КАСЬЦЮКОВІЧЫ.

Работа па распаўсюджаньні «Зьвязды» па раёне праводзіцца нездавальняюча. **Замест росту тыражу ёсьць паніжэньне.** На кастрычнік **выпісваецца 223 экз.,** або 56 проц. да ліку членаў партарганізацый, **супроць 257 экз. у студзені.** Гэта ў той час, як лік членаў партарганізацый і беспартыйнага актыву ў параўнаньні са студзенем значна павялічыўся.

Д.

Менск, друкарня «Зьвязды».

# ІМПЭРЫЯЛІСТЫЧНЫЯ ДРАПЕЖНІКІ

## патрабуюць сваёй часткі ў грабяжы Кітаю

### Дыплёматычнае ўмяшальніцтва ПАЗШ, Францыі і Англіі

*Ноты японскаму і нанкінскаму ўраду.—Жанглываньне пактам Келёга.—Японія пагражае выхадам з Лігі Нацый*

### Новы этап у манчжурскім канфлікце

Дыплёматычнае ўмяшаньне Францыі, ПАЗШ, Англіі і інш. у манчжурскі канфлікт азначае новы этап у разгортваньні гэтых падзей. Зьмена пазыцый Францыі і Англіі зьяўляецца, бязумоўна, дыплёматычным посьпехам ПАЗШ, якім удалося стварыць шчыліну ў блёку гэтых імпэрыялістычных дзяржаў разам з Японіяй.

Падтрымка Лігі Нацый, нэйтралітэт Францыі і Англіі даў магчымасьць японскаму імпэрыялізму ў кароткі тэрмін захапіць усю Паўднёвую Манчжурыю, стаць поўным уладаром яе важнейшых прамысловых, палітычных і гаспадарчых цэнтраў. Японія прасоўваецца ўперад, уклінваючыся ва ўнутраны Кітай, ва ўнутраную Манголію, гэтым закрапаючы інтарэсы таксама і іншых імпэрыялістычных дзяржаў, у прыватнасьці Англіі.

Магутны народны рух супроць японскага імпэрыялізму, які ўзьняўся ў Кітаі, ўсё больш перарастае ва ўсеагульны антыімпэрыялістычны рух, у барацьбу супроць кітайскага аплоту імпэрыялізму — супроць Гаміндану. Гэта выклікае моцныя апасеньні імпэрыялістычных драпежнікаў.

Умяшаньне гэтых дзяржаў азначае, што яны патрабуюць сваёй долі ў крывавай здабычы, сваю частку ў разьдзеле Кітаю. Гэта азначае далейшае абвастрэньне супярэчнасьцяй паміж імпэрыялістычнымі дзяржавамі, рэальную небясьпеку узброеных сутычак, небясьпеку інтэрвэнцыі супроць Кітаю і Савецкага саюзу, за кошт якіх імпэрыялісты дабіваюцца вырашэньня сваіх супярэчнасьцяй.

Характэрна, што цяпер міністэрства замежных спраў спасылаецца на другі пункт пакта Келёга аб тым, што канфлікты павінны быць вырашаны мірным шляхам.

Перад працоўнымі прыгнечанымі ўсяго сьвету гэта ясна выкрывае ўсю фальш, усё машэньніцтва, «міралюбнай» дэмагогіі імпэрыялістаў. Працоўныя з самага пачатку акупацыі Манчжурыі з пільнай увагай прыслухоўваюцца да грукату гармат на далёкім Усходзе.

Працоўныя Савецкага Саюзу будуць пільна, з прыкаванай увагай сачыць за далейшым разьвіцьцём падзей на далёкім Усходзе, якія чрэваты ўсякімі нечаканасьцямі і небясьпекамі новых выбухаў.

## „Пакт Келёга ня можа быць ужыты"

ТОКІЁ. 19. На нарадзе кіраўнікоў міністэрства замежных спраў абмяркоўваліся прапановы Лігі Нацый у сувязі з пактам Келёга. Нарада прышла да аднагалоснага рашэньня, што **японскі ўрад павінен у дэклярацыі паказаць,** што **пакт Келёга ня можа быць ужыты,** па колькі дзеяньні японскіх войск у Манчжурыі не зьяўляюцца ваеннымі дзеяньнямі, накіраванымі да мэты ажыцьцяўленьня нацыянальнай палітыкі, а служаць толькі мерай самаабароны».

## Японія патрабуе расправы з Кітаем сам на сам

ТОКІЁ. 19. У сувязі с чуткамі аб тым, што Ліга Нацый мае намер прапанаваць Японіі эвакуяваць войскі з Манчжурыі **адбылася нарада прадстаўнікоў вышэйшых ваенных улад,** якая пастанавіла, што якія-б парады не давала Ліга Нацый, японскія войска, што знаходзяцца зараз па-за зонаю Паўночна-Манжурскай чыгункі, **павінны заставацца** да ўстанаўленьня парадку і атрыманьня Японіяй ад Кітайскага ўраду гарантыі ў тым, што шляхам японска-кітайскіх перагавораў магчыма будзе канчаткова вырашыць рознагалосьсі. Далеў у пастанове ўказваецца на неабходнасьць зьвярнуць увагу Лігі Нацый на тое, што яе рашэньне аб запрашэньні амэрыканскага наглядальніка супярэчыць устаноўцы Лігі Нацый, і што ў выпадку, калі Ліга Нацый будзе настойваць на сваім няправільным рашэньні **Японія выйдзе з ліку членаў Лігі Нацый.**

## „Катэгарычна ня прыёмлемымі"

### лічыць Японія патрабаваньні Лігі Нацый

ТОКІЁ. 19. Савет міністраў, азнаёміўшыся з паведамленьнем Іосізавы наконт прапаноў Лігі Нацый, якія зьмяшчаюць у сабе побач з іншымі ўмовамі патрабаваньня аб эвакуацыі Манчжурыі, прыняў рашэньне, у якім усе патрабаваньні адзначаюцца «катэгарычна няпрыемлемымі».

**ТОКІЁ. 18. Японскім урадам атрымана нота Францыі: «Урад Францыі зьвяртае ўвагу японскага ўраду на тое, што ён, зьяўляючыся ўдзельнікам пакта Келёга, згодна арт. 2, прыняў на сябе аба вязацельства не спрабаваць вырашаць пытаньня іншымі акрамя мірных сродкаў».**

**ПАРЫЖ. 18. Францускі пасол перадаў нанкінскаму ўраду ноту Брыяна, якая датычыцца пытаньня аб ужываньні пакта Келёга. Як мяркуюць, будуць уручаны таксама ноты ПАЗШ, Англіі і інш. Міністэрства замежных спраў у сувязі з нотай Брыяна заяўляе: «Найбольш знаменацельным фактам зьяўляецца тое, што ўпяршыню афіцыяльна высоўваецца пытаньне аб прымяненьні пакта Келёга, і тым самым падкрэсьліваецца, што пачаць становішча вельмі сур'ёзным».**

## „Давайце, пазбавімся ілюзій"

### Горкае прызнаньне міністра Францыі

ПАРЫЖ, 15. Агенцтва Гавас паведамляе: «Перад ад'ездам у Вашынгтон Ляваль заявіў прадстаўнікам прэсы: «Жорсткі крызіс патрасе ўвесь сьвет. Урады робяць намаганьні, каб **затрымаць гэта зло, якое пашыраецца ўсё далей і далей».** Напомніўшы, што Францыя прыняла прапанову Гувэра і прымала ўдзел у перагаворах у Парыжы, Лёндане і Бэрліне аб міжнародным супрацоўніцтве, Ляваль гаварыў далей: «Паездка, якую я зараз думаю зрабіць, парджае вялікія надзеі. Але давайце лепш унікаць ілюзій. Было-б неасьцярожна чакаць канчатковых рашэньняў дыпляматычных перагавораў і адкрытых тлумачэньняў паміж дзяржаўнымі дзеячамі. **За 4 дні ў Вашынгтоне мы не ўрэгулюем усіх сусьветных пытаньняў, а толькі абменяемся мысьлямі.**

## Аб парадку вылічэньня с.-г. падатку і непадзельных фондаў у калгасах

### Растлумачэньне Наркамзему і Калгасцэнтру БССР

У адказ на артыкул, зьмешчаны ў «Зьвязьдзе» ад 3-X 1931 г. у № 269, аб дачы ўказаньняў аб парадку вылічэньня с.-г. падатку на калгасах, належыць кіравацца наступным:

Для налічэньня с.-г. падатку за 1931 год усе калгасы павінны падлічыць агульны валавы даход калгасу і даход, які абкладаецца (па спэцыяльнай картцы № 1-а):

1. Агульны валавы даход неабходна падлічыць выключна для таго, каб вызначыць ці падлягае калгас абкладаньню с.-г. падаткам (згодна пастановы аб адзіным с.-г. падатку тыя калгасы, у якіх агульны валавы даход складае ня больш 60 руб. на едака, вызваляецца ад с.-г. падатку). Агульны валавы даход вылічваецца наступным парадкам: падлічваецца агульны кошт прадукцыі ўраджаю па мясцовых загатоўчых цэнах, да атрыманай сумы дадаюцца ўсе іншыя даходы гаспадаркі. Атрыманая пасьля гэтага сума і будзе складаць суму агульнага валавога даходу.

2. Сума абкладанага даходу калгасаў вылічваецца наступным парадкам: падлічваецца валавы даход па збожавых культурах (жыта, пшаніца, авёс, ячмень, проса, гарох, віка на насеньне і інш.). Сума валавога даходу збожжавых культур падзяляецца на ўсю колькасьць гэктараў пасеву гэтых культур ураджаю 1931 году. Такім чынам, вылічваецца сярэдняя даходнасьць аднаго гэктара збожжавых. Па суме сярэдняй даходнасьці аднаго гэктара збожжавых падлічваецца ўся сума абкладанага даходу калгасу ад пасеваў ураджаю 1931 году і саду. Плошча ільну і канапель абкладаецца па палавінным даходзе аднаго гэктара збожжавых.

Да атрыманай такім парадкам сумы абкладанага даходу ад пасеваў дадаюцца сумы даходаў іншых галін гаспадаркі, якія абкладаюцца адзіным с.-г. падаткам (даходы сенажаці і неаямляробчыя даходы). Атрыманая сума будзе складаць суму абкладзенага даходу калгасу. З гэтай сумы трэба яшчэ скінуць тыя сумы даходу, па якіх калгасам даюцца ільготы згодна палажэньню аб адзіным с.-г. падатку. Гэтыя сумы наступныя:

а) за зямлю, што перадана калгасу бядняцкімі гаспадаркамі;

б) за чырвонаармейцаў і асоб, прыроўненых да іх;

в) з кошту страхавога насеннага фонду, які вылучаецца ў разьмеры 15 проц. да асноўнага насеннафонду;

д) з кошту запаснога фуражнага фонду (страхавы, кармовы);

е) з сум, адлічаных пры разьмеркаваньні даходаў і ўраджаю ў непадзельны фонд, культ-бытавы фонд, фонд дапамогі вучням, фонд прэміяваньня і фонд на агра-вытворчае абслугоўваньне калгасаў.

Вылічэньне грашовых фондаў, якія адлічваюцца пры разьмеркаваньні ўраджаю і даходаў, праводзіцца наступным парадкам:

Згодна пастановы НКЗ і Калгасцэнтру БССР ад 3-IX 1931 г. гэтыя грашовыя фонды вылічваюцца з сумы даходу калгасу, пераведзенага на грошы (ня ўключаючы насеннага і страхавога, кармовага і запаснога кармовых фондаў) за выпікам з ля сум для аплаты с.-г. падатку, страхоўкі і плацяжоў па крэдытах 1931 году. Падлічыўшы суму даходу калгасу ў грашовым пераводзе (без насенных і кармовых фондаў), **трэба адлічыць сумы плацяжоў толькі страхоўкі і плацяжоў па крэдытах. З рэшты сумы трэба вылічыць устаноўленыя процанты ў грашовыя фонды.** Атрыманыя такім парадкам сумы фондаў, як пальгочная частка даходу, выключаюцца з абкладанага даходу калгасу.

Сума с.-т. падатку налічваецца па 3 капейкі з кожнага рубля сумы абкладанага даходу за вылікам пералічаных вышэй пальгочаных частак даходу.

Падлічаная такім парадкам пастаянная сума с.-г. падатку кладзецца ў аснову пры вылічэньні грашовых фондаў ва ўстаноўленых процантах, пры складаньні пляну разьмеркаваньня даходаў і ўраджаю за 1931 год. Напрыклад, калі сума даходу калгасу (без насенных і кармовых фондаў) у пераводзе на грошы складае 53.000 руб., а абавязковыя плацяжы - страхоўка 950 руб. і па крэдытах 1.500 руб., дык трэба раней з сумы 53.000 руб. адлічыць 2.450 руб., а з рэшты сумы ў 51.550 руб. вылічыць грашовыя фонды (15 проц. у непадзельны, 2 проц. у культурна - бытавы і проц. у прэміяльны, 1 проц. у фонд дапамогі вучням і 1 проц. у фонд на агра-вытворчую дапамогу), усяго 20 проц., што складае суму 9.110 руб.

Уся сума абкладанага даходу калгасу складае 45.000 руб. Адлічваем з яе сумы даходу, якія падлягаюць ільготам, што паказаны вышэй у пунктах «а», «б», «в», «г», «д», і «е», прыкладна ўсяго 25.160 руб., застаецца для абкладаньня 19.840 руб. Сума с.-г. падатку па гэтым калгасе будзе складаць 19.840×3=595 рублей 20 кап. Цяпер робім «канчатковае вылічэньне грашовых фондаў. Сума даходу калгасу без насенных і кармовых фондаў складае 53.000 руб., вылічаем з яе сумы с.-г. падатку 595 руб., страхоўкі 950 руб. і плацяжоў па крэдытах 1.500 руб. З сумы, якая засталася ў 49.955 руб., вылічваем у непадзельны фонд 7.493 руб., 2 проц.,—культурна - бытавы фонд—999 руб. 10 кап., 1 проц.—у прэміяльны фонд—499 руб. 55 кап., 1 проц. у фонд дапамогі вучням —499 руб. 55 кап. і 3 проц. у фонд для разьмеркаваньня на аграмаджанай маемасьці — 1.498 руб. 65 кап.

Налічэньне с.-г. падатку па калгасах павінна быць зроблена да 20 кастрычніка і праводзіцца разам са складаньнем пляну разьмеркаваньня даходаў і ўраджаю.

Падрабязная інструкцыя аб парадку налічэньня с.-г. падатку на калгасах разаслана Наркамфінам Беларусі 3-X 1931 году.

Член праўленьня Белкалгасцэнтру
БАЛЦІН.
Член калегіі Наркамфіну БССР
АЙЗЭНСОН.

„Чыр. Зорка" Пач. 7 і 8-45; 10-30 — АМЭРЫКАНСКІ ФІЛЬМ Даліна агнёстых скал. Драма ў 7 част.
„КУЛЬТУРА" Пач. 7; 8-45; 10-30 — Новы замежны фільм САПРАЎДНЫЯ ПАНЫ. ЗВЫШ ПРАГР. Ударная будоўля.
„Інтэрнацыянал" Адкр. з 12 ч. дня — Усходні мастацкі фільм ЗЭЛІМ ХАН. Звыш прагр. хроніка
ПРАЛЕТАРЫ Адкр. з 12 г. дня. — МОНШ БЭНКС у замежн. фільме ГОНШЧЫК СУПРОЦЬ ВОЛІ. Пач. 1-га сэансу ў 2 г. дня.
„Юныя Піянэр" (будынак кіно „Культура") — Мастацкі фільм „ТРОЕ" у 7 ч. Пач. у 1 г. Каса—з 11 г.
„СПАРТАК" Каса адкрыта з 5 г. — Выдатны фільм „КРУГ" драма ў 7 частках

20-га КАСТРЫЧНІКА, у 6 гадз. веч., у клюбе друкароў (Ленінская, 13) СКЛІКАЕЦЦА
агульна-гарадзкі сход прафактыву.
ПАРАДАК ДНЯ:
АБ ПЕРАВЫБАРАХ ФАБЗАВІЗЯЦКОМАЎ.
Яўка прафактыву абавязкова і без спазьненьня.
МЕНГАРПРАФСАВЕТ.

Пашыранае пасяджэньне прэзыдыуму ЦК МОПР'у БССР
адбудзецца
20 кастрычніка, у 7 гадз. веч., у пам. ЦК МОПР.
ПАРАДАК ДНЯ:
1) Даклады заводскіх арганізацый МОПР'у зав. імя Ланцуцкага (Гомель) і „Бальшавік" (Менск)
2) Суданклад Гомельскага і Менскага ГК МОПР'у аб рабоце на буйных прадпрыемствах.
3) Даклад ячэйкі МОПР'у калгасу імя 1-га Мая (Віцебскі р-н) і суданклад Віцебскага ГК МОПР'у аб рабоце ў сапыялістычным сэктары вёскі.
4) Дырэктыва аб правяраньні 14 гадавіны Кастрычніка.
5) Даклад інструктароў аб выніках абсьледваньня раённых арганізацый. Яўка ўсіх членаў і кандыдатаў прэзыдыуму і ЦК абавязкова. Запрашаецца актыў
Сакратар ЦК МОПР'у БССР ЦУДЗІН

„САЮЗСЕЛЬЭЛЕКТРА"
АБВЯШЧАЕ НАБОР
у школу вучнёўства па электрыфікацыі сельскай гаспадарчы (электрасельвуч) у гор. Менску.
Курс навучаньня паўтары гады. Патрэбна адукацыя за 4-х годку. Узрост ад 16 год. Школа рыхтуе электрамацёраў. Вучні атрымліваюць стыпэндыю (52 руб. 25 кап. у месяц).
Заявы са спраўкай аб адукацыі і сацпахожданьні падаваць да 25-га кастрычніка на адрас: Менск, Савецкая, 66. Дом Пісьменьніка, Загадчыку сэкт. кадраў В. Залуцкаму.
Белканторa Саюзсельэлектра.

Менскі дзяржаўны архітэктурна-будаўнічы тэхнікум
паведамляе студэнтаў і выкладчыкаў, што
ЗАНЯТКІ ў тэхнікуме пачынуцца на II і III курсах
21 кастрычніка, у памяшканьні былога політэхнікуму:
II курсы—з 8 гадз. раніцы,
III курсы—з 4 гадз. дня.
Аб пачатку заняткаў на I курсах будзе паведамлена асобна.
Дырэкцыя тэхнікуму.

ЗАНЯТКІ НА ПРАПАГАНДЫСЦКІМ, САВЕЦ. І ГАЗЭТНЫМ АДДЗЕЛ. У КАМУКІСТЫЧ. УНІВЭРСЫТЭЦЕ БССР імя ЛЕНІНА
ПАЧНУЦЦА
10 лістапада.
Папярэджваецца, што для сем'яў студэнтаў кватэры на будуць прадстаўлены.

Прэзыдыум Бел. МБІТ паведамляе,
што
па справах аб ІТС
неабходна зварачацца ў ЦСПСБ, Дом Працы, 2-гі паверх, пакой № 8, тэл. № 1-29 два званка.
Бел. МБІТ.

Машыністка
шукае вечэрнюю працу
Адрас у канторы „ЗЬВЯЗДЫ".

Меняю пакой у Адэсе, цэнтр гораду, на пакой у Менску.
Даведацца: Камуны 3-ці інтэрнат, пав. № 1, ДУБАСАРСКІ

НОВА-АДКРЫВАЕМАЯ Ў г. МСЬЦІСЛАЎЛІ
Беларуская центральная школа па падрыхтоўцы работнікаў вучоту для калгасгістыкі
абвяшчае АРЫЁМ у ШКОЛУ.
Тэрмін навучаньня—6 мес. Пачатак заняткаў—1-ге лістапада г. г.
Прымаюцца асобы ва ўзросьце ня ніжэй 18 і ня вышэй 40 год, якія маюць адукацыю за 1 канцэнтгодні, або маюць веды ў абсяге гэтага. Залічаныя ўшколу забясьпечваюцца стыпэндыяй і інтэрнатам. Пасьцельнымі прыладамі школа не забясьпечвае. Пры прыёме аддаецца перавага ўдарнікам—членам калгасаў і прафсаюзаў, а таксама парт. і камсамольцам. Патрэбны дакументы: 1) аб сац. становішчы і праве голасу, 2) аб узросьце, 3) аб адукацыі, 4) аб стане здароўя, 5) камандыроўка або рэкамэндацыя ад парт., камсам., калгасн., прафс., сав. арганізацый (ад адной з пералічаных).
Заявы і дакументы напіроўваць: г. Мсьціслаўль, Беларуская центральная школа работнікаў вучоту калгасгістыкі.
ДЫРЭКЦЫЯ.

Аддзел кадраў пры друкарні імя Сталіна
АБВЯШЧАЕ АСЕНЬНІ НАБОР У ШКОЛУ
(школа вучн. мас. прафесій)
для падрыхтоўкі разборшчыкаў і наборшчыкаў
Вучні забясьпечваюцца стыпэндыяй у разьмеры 36 руб. першыя тры месяцы. Інтэрнату няма.
Прыём заяў з 18 па 25 кастрычніка.
АДДЗЕЛ КАДРАЎ

Кошт публікацыі 1 р. аб згубе 1 дакумэнту

БІБЛІЯГРАФІЯ

## КНІЖКА У ЯКОЙ ІГНАРУЮЦЦА

### новыя задачы ў калгасным будаўніцтве

М. КАЛМЫК.—«Дзень вялікіх перамог» (Менск, 1931 г., ДВВ, тыраж 7.000, старонак 36, Цана 10 кап.).

Кніжка спэцыяльна выпушчана да «Дня ўраджаю і калектывізацыі». Яе зьмест коратка можна характарызаваць словамі самаго аўтара: «Калектывізацыя —генэральная задача. Няхай «Дзень ураджаю і калектывізацыі»—сёлета пройдзе пад знакам хвалі новага прыліву бядняцка-серадняцкага сялянства ў калгасы (стар. 9 і 32). Чытач бачыць, што які пачатак кнігі, такі і канец. Аўтар ставіць пытаньне так, што як быццам асноўная задача сёпеннята дня—гэта арганізацыя новага магутнага прыліву ў калгасы. З гэтай мэтай ён пачынае разважаць аб тэмпах калектывізацыі.

«За адзін толькі жнівень у некаторых раёнах разгорнуты такія тэмпы ў рабоце па калектывізацыі, што каб такія тэмпы ўжываліся ў гэтых раёнах заўсёды, дык справа суцэльнай калектывізацыі была-б даўно ўжо скончана... «За» ці «супроць» калгасу—трэба ставіць пытаньне асабліва ў тых раёнах, дзе процант калектывізацыі вельмі нізкі».

Якая архірэвалюцыйная адсябіцына. Аўтар усе сілы пакладае на тое, «каб аднаасобнікі беднякі і сераднякі зразумелі, што справа калектывізацыі дыктуецца самім жыцьцём, што іншай дарогі, апрача калектывізацыі няма» (стар. 11). Наўжо аўтару невядома, што 60 проц. працоўнага сялянства Савецкага Саюзу, 50 проц. працоўнага сялянства БССР ужо даўно зразумелі сваю задачу, сталі на шлях сацыялістычнага разьвіцьця сельскай гаспадаркі, на шлях буйной калгаснай вытворчасьці, што калгасьнік стаў галоўнай апорай партыі на вёсцы, стаў цэнтральнай фігурай зямляробства. Беднякі і сераднякі зразумелі, але не зразумеў гэтага аўтар «рэвалюцыйнай» фразы.

Аўтар «Дня вялікіх перамог» прэтэндуе на правільнае растлумачэньне генэральнай лініі партыі ў калгасным будаўніцтве. Аднак ён сам не разумее тых «вялізарных колькасных і якасных зрушэньняў у ўсім сацыяльна-эканамічным абліччы нашай краіны, якія настойліва патрабуюць зьмены мэтадаў, прыёмаў работы і кіраўніцтва». («Правда»).

Новая абстаноўка патрабуе новых мэтадаў, высоўвае новыя лёзунгі. Бальшавіцкая партыя тым і моцная, што яна, карыстаючыся мэтадам дыялектычнага матар'ялізму, умее на кожным этапе, пры зьмене абстаноўкі, своячасова ўхапіцца за асноўнае вядучае зьвяно, высунуць адну першачарговую задачу, якой падпарадкоўцца ўсе астатнія.

У мінулым годзе, сьвяткуючы «Дзень ураджаю і калектывізацыі» мы ставілі асноўнай задачай—ущчтненьне новых беднякоў і сераднякоў у калгасы. У гэтым годзе, выконваючы дырэктывы ЦК партыі, мы ставім цэнтральнай задачай арганізацыйна-гаспадарчае ўмацаваньне калгасаў. І толькі на аснове арганізацыйна-гаспадарчага ўмацаваньня мы завяршым суцэльную калектывізацыю і ліквідацыю кулацтва, як клясы. Пара гэта зразумець кожнаму камуністу.

Аўтар агітуе «шырокія колы беднякоў і сераднякоў, каб яны не сталі ў баку від таго цяжкага змаганьня, якое праходзіцца вытрымліваць нам у справе калектывізацыі супроць кулацтва». (стар. 11-я). Тут ён зноў, дзякуючы сваёй палітычнай блізарукасьці, дапускае трубую палітычную памылку. Яраз бядняцка-серадня